

НЕТЫПОВЫЯ ПРАФЕСІІ БЕЛАРУСАК 4

ЯК ПАДТРЫМАЦЬ ЭКАЛАГІЧНАЕ ЗЕМЛЯРОБСТВА? МС





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

29 САКАВІКА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 59 (28926)



9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім ЕРМАЛОВІЧ, міністр фінансаў:**

*«Прыярытэт на бягучы год відавочны — павышэнне заработнай платы нізкааплатных катэгорый работнікаў, зблiжэнне мінімальнай заработнай платы і мінімальнага спажывецкага бюджэту. У сярэднетэрміновай перспектыве (да 2025 года) неабходна выйсці на мэтавы паказчык па сярэдняй заработнай плаце ўрача на ўзроўні 150 працэнтаў да сярэдняй зарплаты па эканоміцы, педагагічнага работніка — на ўзроўні 100 працэнтаў. Сёлета плануецца прыцягнуць рэалізацыю намечаных планаў па павышэнні ўзроўню аплаты працы ў бюджэтным сектары. Мэтавая задача — забяспечыць суадносіны заработнай платы бюджэтнікаў да сярэдняй па эканоміцы на ўзроўні 80 працэнтаў, а суадносіны працоўных пенсій і заробку ў эканоміцы — на ўзроўні не менш за 40 працэнтаў. Пры гэтым канцэптуальна зменіцца сістэма аплаты працы ў бюджэтным сектары. У студзені падпісаны Указ № 27, які прадугледжвае ўзмацненне дыферэнцыяцыі заработнай платы ў залежнасці ад якасці і вынікаў працы кожнага работніка».*

## КОРАТКА

- **Мінск узначаліў рэйтынг папулярных у расіян гарадоў для адпачынку на майскія святы.**
- У сацсетцы «Аднакласнікі» з'явілася беларуская мова.
- **ЕБРР выдзеліў 106 млн еўра на рэканструкцыю 11 мастоў у Беларусі.**
- Гомельскі фатограф Аляксей Герасіменка стаў прызёрам конкурсу ASE International Photo Awards 2019.




ISSN 1990 - 763X


# АГУЛЬНАЕЎРАПЕЙСКАЯ ПАМЯЦЬ

## Аляксандр Лукашэнка і Себасцьян Курц адкрылі помнік аўстрыйскім ахвярам нацызму





Фота БелТА.

**Вялізны камень, расколаты на дзесяць частак. Дзесяць асколкаў — гэта пералік чыгуначных саставаў, на якіх людзей прывозілі на месца расправы, у лагер «Трасцянец», дзесяць тысяч — гэта прыблізная колькасць загубленых там аўстрыйцаў яўрэйскага паходжання. Новы манумент змяшчае імёны ахвяр, таму і носіць адпаведную назву «Масіў імёнаў». Помнік стаў яшчэ адной скульптурай, усталяванай у мемарыяльным комплексе «Трасцянец», які ўключае ў сябе аднайменны былы лагер смерці, крэматорый ва ўрочышчы Шашкоўка і брацкія магілкі ва ўрочышчы Благаўшчына. У чэрвені мінулага года ў мітынгу-рэквіеме ў Благаўшчыне ўдзельнічалі прэзідэнты Беларусі, Германіі і Аўстрыі.**

Учора ў мемарыяльным комплексе, які мае агульнаеўрапейскае значэнне, новы манумент адкрылі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Федэральны канцлер Аўстрыі Себасцьян Курц.

«Народы Беларусі і Аўстрыі, як і ўсе народы Еўропы, перажылі агульную крывавую трагедыю Другой сусветнай вайны. Мільёны грамадзян нашых краін сталі ахвярамі нацысцкай палітыкі генацыду. Сёння нас аб'ядналі боль памяці і покліч сумлення, маральны і чалавечы абавязак, адказнасць за лёсы будучых пакаленняў. Злачынствы, здзейсненыя гітлераўцамі, уражваюць сваёй бязмежнай жорсткасцю. Вар'яцкія, антыгуманныя ідэі фашыстаў увасобіліся ў дзяржаўнай палітыцы Трэцяга рэйха. Для «пашырэння жыццёвай прасторы на ўсход» былі распрацаваны падрабязныя планы. Яны абапіраліся на дасягненні навукова-тэхнічнага прагрэсу і жахалі сваёй педантычнасцю. Расавыя законы прызналі непатрэбным існаванне мільёнаў людзей», — сказаў Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі адкрыцця.

Забойства людзей у канцэнтрацыйных лагерах было пастаўлена на паток, таму іх называлі «фабрыкамі смерці». І адна з іх знаходзілася ў Малым Трасцянцы.

«На гэтай самай зямлі была пралітая кроў многіх дзясяткаў тысяч бязвінных ахвяр, сярод якіх — дэпартаваныя грамадзяне з краін Еўропы, мірныя жыхары, партызаны, падпольшчыкі, савецкія ваеннапалонныя», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт назваў гады акупацыі адной з самых трагічных старонак у гісторыі.

«Памяць аб загінулых у барацьбе за свабоду і незалежнасць Радзімы, за вызваленне планеты ад карычневай чумы, памяць аб ахвярах нацызму для нашага народа свяшчэнная. Беражлівыя адносіны да яе сталі часткай нацыянальнай ідэі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Асэнсаванне ўрокаў Другой сусветнай вайны знаходзіць адлюстраванне і ў міралюбівай палітыцы Беларусі, у паслядоўным і шчырым імкненні беларусаў уносіць уклад ва ўрэгуляванне канфліктаў, зніжэнне напружанасці праз садзейнічанне дыялогу і супрацоўніцтву ў рэгіёне і свеце.

Па словах кіраўніка беларускай дзяржавы, стварэнне ў Трасцянцы мемарыяла агульнаеўрапейскай значнасці — гэта вынік сумесных намаганняў беларускай дзяржавы, палітыкаў і грамадскіх дзеячаў, прадстаўнікоў рэлігійных арганізацый, кіраўніцтва і жыхароў гарадоў Еўропы і, канешне ж, сведкаў тых часоў, якія выжылі, родных загінулых.

«Мы з вялікім уздымам і гатоўнасцю падтрымалі ініцыятыву нашых аўстрыйскіх сяброў, перш за ўсё прэзідэнта Аўстрыі, канцлера Аўстрыі, аб увекавечанні памяці аб грамадзянах Аўстрыі, якія загінулі ў лагеры смерці «Трасцянец», — расказаў Прэзідэнт Беларусі. — Манумент «Масіў імёнаў», які мы адкрываем сёння, не проста вяртае з небыцця імёны тысяч ахвяр. Ён сімвалізуе імкненне новых пакаленняў ведаць аб трагічным лёсе сваіх продкаў і захоўваць памяць аб іх».

У сваю чаргу Федэральны канцлер Аўстрыі Себасцьян Курц адзначыў: «Афіцыйная Аўстрыя — я, на жаль, вымушаны гэта прызнаць — вельмі доўгі час уносіла свой уклад у тое, што мы гэтак доўга так мала ведалі аб гэтай трагедыі. Мы пазбягалі адказнасці, аднак сёння мы зрабілі важны крок да таго, каб памятаць пра тыя падзеі, якія адбываліся тут, памятаць пра тых людзей, у якіх спачатку адабралі маёмасць, а затым іх свабоду, і ў рэшце рэшт адабралі тут іх жыццё. Мы ніколі не забудзем гэта месца і яго назву. Яно падкрэслівае нашу адданасць дэвізу «Ніколі больш», — сказаў Себасцьян Курц.

Падчас цырымоніі адкрыцця помніка спадарыня Вальтраўд Бартан, кіраўнік венскага аб'яднання «Заўсёды памятаць аб Малым Трасцянцы», зачытала імёны ахвяр, якія нарадзіліся 28 сакавіка. Затым галоўны кантар аўстрыйскай сталіцы Шмуэль Барзілай зачытаў памінальную малітву — кадыш.

Пасля гэтага Аляксандр Лукашэнка, Себасцьян Курц, прысутныя госці ўсклалі кветкі да помніка.

Мемарыял «Масіў імёнаў» створаны на сродкі Ведамства Федэральнага канцлера Аўстрыі і Нацыянальнага фонду Аўстрыі для ахвяр нацыянал-сацыялізму. Канцэпцыю распрацаваў архітэктар з гэтай краіны — Даніэль Занвальд, а ўвасобіў ідэю ў скульптуру з фібрабетону беларус Канстанцін Касцючэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# «Я НІКОЛІ НЕ ЗМІРУСЯ, КАБ У МАЁЙ КРАІНЕ БЫЎ БАРДАК»

**Учора Прэзідэнт правёў кадравыя перастаноўкі. Зразумела, не абышлося без каментарыяў з нагоды гучнай камандзіроўкі на Магілёўшчыну.**

## Справы сталічныя

Але спачатку — аб прызначэннях. Так, Сяргей Масляк быў узгоднены на пасаду кіраўніка адміністрацыі сталічнага Заводскага раёна. Да гэтага ён з'яўляўся старшынёй Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Кіраўніком адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Мінска стаў Генадзь Любатынскі, які раней займаў пасаду дырэктара камунальнага ўнітарнага дачцынага прадпрыемства «Упраўленне капітальнага будаўніцтва Заводскага раёна Мінска».

На пасаду кіраўніка адміністрацыі Партызанскага раёна сталіцы кіраўнік дзяржавы ўзгадніў прызначэнне Валерыя Вараніцкага, раней — першага намесніка кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска.

Сяргей Шкрудпеў — новы кіраўнік адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска, да гэтага ён займаў пасаду намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення па справах дзяржаўных органаў — начальніка ўпраўлення рэгіянальнага развіцця Апарату Савета Міністраў Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што няма неабходнасці распавядаць, што такое Мінск, як ён будзе развівацца і якія патрабаванні будуць прад'яўляцца. «Вы гэта не адзін раз чулі ад мяне, працуючы на папярэдніх пасадах. Разумееце, куды ідзяце і што патрабаванне за сітуацыю ў Мінску будзе не толькі са старшыні гарвыканкама і ўпаўнаважанага па горадзе-герою Мінску, а таксама з памочніка, але перш за ўсё з вас. Вы — людзі, якія знаходзяцца на перадавой, на фронце, тварам у твар не з ворагам, а з нашымі мінчанамі», — адзначыў Прэзідэнт.

Гэта значыць, элементарныя пытанні жыхароў Мінска лягуць на плечы нованазначаных кіраўнікоў, растлумачыў ён.

«Мінск павінен утрымлівацца ў ідэальным парадку», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, не толькі жыхары сталіцы, але і прыезджыя вельмі добра адгукаюцца пра горад, называюць яго чыстым і дагледжаным. Аднак, дадаў беларускі лідар, на гэтым спыняцца нельга, — і гэта звязана не толькі з тым, што сёлета сталіца прыме буйныя спартыўныя мерапрыемствы.

У аснове ўсяго, чарговы раз паўтарыў ён, павінны ляжаць дысцыпліна і парадак, каб не было падобных разборак, як адбылося на Магілёўшчыне.

Дарэчы, яшчэ ён заклікаў прыцягваць людзей да добраўпарадкавання горада. Аднак павінна быць чалавечае стаўленне.

## А што ў рэгіёне?

Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў прызначэнне Аляксандра Ласевіча на пасаду старшыні Лагойскага райвыканкама. Раней ён займаў пасаду першага намесніка старшыні — начальніка ўпраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Пухавіцкага райвыканкама.

«Лагойскі раён мяне, шчыра кажучы, насцярожвае, я даўно там не быў на зямлі, а пастаянна лётаю над раёнам і назіраю за тым, што там адбываецца. Вельмі зручны раён, там можна жыць і працаваць, людзі павінны радавацца, што там жывуць. Фактычна горад-спадарожнік Мінска, там мы будзем развіваць Мінск — у Лагойску, Смалявічах, Дзяржынску і іншых такіх гарадах, — сказаў Прэзідэнт. — Працэс гэты ўжо пачаўся. Хай павольна, але ён пачаўся».

У сувязі з гэтым Лагойск павінен атрымаць развіццё і за кошт будучых жыхароў, якія, магчыма, з гэтага горада будуць прыязджаць на працу ў сталіцу. Таму важна забяспечыць іх транспартам. «Мы падумаем аб тым у будучыні, каб сувязь з Лагойскам, Смалявічамі, Дзяржынскам ды іншымі цэнтрамі-спадарожнікамі горада Мінска была і па рэйках, надзейная. Электрычка, трамваі... тралейбусы. Мы падумаем пра электрычны транспарт. Старшыня гарвыканкама такую задачу ўжо мае», — адзначыў беларускі лідар.

Такім чынам, Анатоль Сівак павінен прапанаваць найбольш эфектыўны варыянт сувязі з гарадамі-спадарожнікамі.

Яшчэ адзін напрамак, пра які казаў Прэзідэнт у кантэксце Лагойскага раёна, — гэта сельская гаспадарка. «Лагойск не павінен плесціся ў хвасце падзей у развіцці сельскай гаспадаркі. Яна павінна ў Лагойскім раёне развівацца не горш, чым у Мінскім», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

## У эканоміцы адстаць нельга

Андрэй Лучанок, цяпер ужо былы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення Афрыкі і Блізкага Усходу галоўнага ўпраўлення Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі МЗС, прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах і па сумяшчальніцтве ў Кувейце, Бахрэйне і Саудаўскай Аравіі.

Паводле слоў Прэзідэнта, нельга сказаць, што за гады супрацоўніцтва з гэтымі краінамі Беларусі ўдалося выбудаваць магутныя гандлёва-эканамічныя адносіны — а гэта галоўнае, чым трэба займацца. «Рэгіён няпросты, нябедны, і гандаль з ім мы павінны пашыраць. Гэта галоўная ваша задача там», — сказаў ён.

Рэцэпт просты: будзе эканоміка — будзе дыпламатыя і палітыка, лічыць кіраўнік дзяржавы.

Яшчэ беларускі лідар узгадніў прызначэнне на пасаду генеральнага дырэктара ААТ «Гомсельмаш» Аляксандра Новікава, раней — дырэктара па развіцці ТАА «МеталБуд Сік».

Ён прапрацаваў на розных пасадах на «Гомсельмашы» 18 гадоў. Беларускі лідар заклікаў новага кіраўніка не закрываць вочы на праблемы і разабрацца ва ўсім. Ён адзначыў, што пасля візіту на гэтае прадпрыемства заклікаў «пільна на яго паглядзець», паколькі сігналы былі.

«Гомсельмаш» трэба паставіць на ногі. І галоўнае — гэта якасць. Так, нядрэнную тэхніку мы выпрабляем, але калі не будзем працаваць над якасцю, нас выпхнуць з рынку», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## Міліцыя — пакуль не на 10 балаў

Начальнікам Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі кіраўнік дзяржавы прызначыў Сяргея Дарошку, які да гэтага займаў пасаду начальніка галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама. Яго былую пасаду зойме Іван Кубракоў, раней — начальнік упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама. А гэтую пасаду, у сваю чаргу, зойме Міхаіл Грыб, які да гэтага працаваў намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама — начальнікам міліцыі грамадскай бяспекі.

Па словах кіраўніка дзяржавы, міліцыя — гэта аснова ўсёй грамадскай бяспекі, барацьбы з крыміналам. Калі ёсць эфектыўная работа — ёсць і вынік. «Калі абсалютна шчыра, я не магу сёння па 10-бальнай шкале паставіць адзнаку 9 або 10. Не магу. І нават 8 — з нацяжкай», — сказаў беларускі лідар.

Ён падкрэсліў, што лішні раз пераканаўся ў гэтым, наведваючы Магілёўскую вобласць. Тлумачым: перад пасяўной кампаніяй Прэзідэнт папрасіў міністра ўнутраных спраў навесці парадак на машынным двары, з усім, што звязана з тэхнікай, праверыць дакументацыю.

На яго думку, калі б даручэнне было выканана, то бардака на адным з машынных двароў на Магілёўшчыне не было б. Так што парадак павінен быць усюды — не толькі па барацьбе з крыміналам. Трэба аказаць дапамогу і па кантролі за захоўваннем тэхнікі, памяшканняў.

## Па транспарце і МЗС

Акрамя таго, у рабочым парадку былі ўзгоднены яшчэ пяць прызначэнняў.

Першым намеснікам міністра транспарту і камунікацый стаў Аляксей Ляхновіч, раней — намеснік міністра транспарту і камунікацый. У сваю чаргу, яго былую пасаду атрымаў Андрэй Іваноў, дырэктар дзяржаўнай установы «Белаўтастрада».

Таксама на пасаду намесніка міністра транспарту і камунікацый была ўзгоднена Наталля Александровіч, да гэтага яна была начальнікам галоўнага ўпраўлення эканомікі і фінансаў Міністэрства транспарту і камунікацый.

Дырэктарам Дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў стаў Юрый Гарэлік. Да гэтага ён займаў пасаду намесніка дырэктара Дэпартамента — начальніка ўпраўлення знешнегандлёвай палітыкі.

Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Бангладэш і Непале па сумяшчальніцтве стаў Андрэй Ржэўскі — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Індыі і па сумяшчальніцтве ў Шры-Ланцы.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## Справа не столькі ў брудных каровах

Аляксандр Лукашэнка таксама пракаментаваў сваю апошнюю камандзіроўку, якая для асобных кіраўнікоў скончылася адстаўкамі.

«Я вось паглядзеў па слядах гэтых разборак у Магілёве... Некаторыя там пачалі зміяшчаць акцэнты. Ледзь не «Лукашэнка не з той нагі ўстаў, прыйшоў тут, разборкі зладзіў, разагнаў усіх, — сказаў ён. — Магілёўшчына пляцецца ў хвасце развіцця ўсёй краіны, ніякага руху наперад. І губернатар быў апошні раз у мінулым годзе папярэджаны, што па выніках года мы паглядзім на іх працу. І ў тым ліку на кіраўнікоў рэспубліканскага звяна».

Прэзідэнт дадаў, што хоча, каб людзі разумелі: пытанне не столькі ў тым, што ў малочнатаварным комплексе «Сліжы» былі брудныя каровы.

«Гэта проста людзі не ведаюць, што тыя каровы абышліся краіне на вагу золата. Мы іх збіралі па ўсёй краіне, каб укамплектаваць малочнатаварны комплекс. І гэтыя каровы не павінны па пяць, каля пяці тысяч кілаграмаў малака даваць у год. Гэта таксама нядрэнны надой на гэтым комплексе — але гэта не для гэтых кароў. Ну а тэхналогія ўтрымання — агідная. Бачыце вы, карове не загадаеш, дзе ёй легчы, — у гнаявую жыжу ці сухое месца, дзе салома свежанькая і гэтак далей. Але гэта хай раскажуць тым, хто не бачыў кароў ніколі. Калі карове прапанаваць жыжу, гной або сухое месца, ніколі карова не ляжа ў жыжу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, самае галоўнае — гэта бездакзнасць. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што калісьці гэта была занядбаная ферма, потым пачалі будаваць комплекс, але кінулі, пасля чаго ўсё ж такі дабудавалі, збіраючы грошы па ўсёй краіне. Там былі створаны самыя пародзістыя статкі, усё выбудавалі па тэхналогіі.

«Аказваецца, у іх саломы не хапіла. А да гэтага часу ў валках на полі салома там валяецца. А большую частку — зааралі, таму што не змаглі сабраць, не арганізавалі людзей. Вось і праблема, — растлумачыў беларускі лідар. — Ад чаго гэта? Людзі не навучыліся быць удзячнымі, а ім проста не сказалі, што гэта за кошт усёй краіны вам пабудавалі комплекс. Што вам стварылі самыя лепшыя ўмовы для таго, каб зарабіць добрую заработную плату, для таго, каб вы мелі працу, таму што гэта адна з самых глухіх гаспадарак у краіне, у глухмені знаходзіцца. Але там добрыя землі. І звярніце ўвагу — гэта гаспадарка, якая належала ўчора прыватніку. Значыць, усе мы хварэем — і прыватнікі, і прадпрыемствы кааператыўныя, і дзяржаўныя — на адну хваробу. Не трэба маліцца на прыватніка і думаць, што ўсё яму з неба зваліцца і ён там ідэальны парадак навядзе».

Прэзідэнт дадаў, што павінна быць штодзённая карпатлівая праца, а ў такіх гаспадарках — і жалезная дысцыпліна, таму Адміністрацыі Прэзідэнта і КДК было даручана перавесці іх на ваеннае становішча. Павінен быць вынік, таму трэба працаваць з людзьмі на месцах, іншага не дадзена.

Ён звярнуў увагу на «заслугі» начальства. «Усё ў нас, у начальнікаў. Мы агідна працуем, бездакзана», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка зноў падкрэсліў, што патрабаванні будуць толькі нарастаць, — падобны стыль кіраўніцтва Прэзідэнт падтрымлівае ўвесь час. Ён нагадаў, што сам працаваў у гаспадарцы, бачыў усё на свае вочы, таму ведае, чаго патрабуе. «І я ніколі не змірыся, каб у маёй краіне быў бардак, тым больш на маіх вачах», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Уладзе нельга адстаць, сказаў ён, трэба быць на крок наперадзе, тады ўсё будзе нармальна. «Мы павінны паказаць у гэтыя два гады, хто ў доме гаспадар», — адзначыў беларускі лідар.

## Паездка дала сумны вынік

Услед за адстаўкамі ў Магілёўскай вобласці па выніках рэзананснай камандзіроўкі Прэзідэнта адбыліся яшчэ дзве на самым высокім узроўні. Так, Міхаіл Русы вызвалены ад пасады намесніка прэм'ер-міністра Беларусі, а Леанід Заяц вызвалены ад пасады міністра сельскай гаспадаркі і харчавання нашай краіны.

---

Афіцыйна

# Падтрымаюць рублём

### Аднаразовая матэрыяльная дапамога будзе выплачана да 75-годдзя вызвалення Беларусі

**Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і асобныя катэгорыі грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, атрымаюць матэрыяльную дапамогу ў сувязі з 75-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта прадугледжана Указам № 118 «Аб аказанні аднаразовай матэрыяльнай дапамогі», які 28 сакавіка падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Матэрыяльная дапамога ў памеры Br2 тыс. будзе аказана Героям Савецкага Саюза, асобам, узнагароджаным ордэнамі Славы трох ступеняў, Героям Сацыялістычнай Працы, удастоеным гэтага звання за заслугі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, асобы, якія прымалі ўдзел у абароне Айчыны да 3 верасня 1945 года, а таксама асобы, якія прымалі ўдзел у складзе спецыяльных фарміраванняў у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах, атрымаюць па Br1,5 тыс.

Выплаты ў памеры Br800 будуць праведзены асобам, узнагароджаным ордэнамі або медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную воінскую службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама асобам, якія працавалі на аб'ектах супрацьпаветранай абароны, мясцовай супрацьпаветранай абароны, на будаўніцтве абарончых збудаванняў, марскіх баз, аэрадромаў і іншых ваенных аб'ектаў у межах тылавых граніц дзеючых франтоў, на прыфрантавых участках чыгунак і аўтамабільных дарог. Такая ж сума будзе выплачана асобам, якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях Ленінграда ў перыяд блакады горада з 8 верасня 1941 года да 27 студзеня 1944 года, асобам, узнагароджаным медалём «За абарону Ленінграда», і тым, хто ўзнагароджаны знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда».

Матэрыяльная дапамога ў памеры Br650 будзе аказана членам сем'яў ваеннаслужачых, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі (памерлі), зніклых без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны (жонцы (мужу), якая не ўступіла (які не ўступіў) у новы шлюб, дзецям (у тым ліку ўсыноўленым, удачароным) і іншым утрыманцам, якім устаноўлена павышэнне пенсіі па ўказаных падставах у адпаведнасці з заканадаўствам). Гэтая ж сума будзе выплачана былым вязням фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны (у выпадку калі для гэтай катэгорыі ўстаноўлена павышэнне пенсіі па ўказанай падставе ў адпаведнасці з заканадаўствам). Таксама па Br650 атрымаюць інваліды з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі, калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны або з наступствамі ваенных дзеянняў. Выплаты аднаразовай матэрыяльнай дапамогі будуць праведзены ў перыяд з 1 чэрвеня да 1 ліпеня 2019 года.

Парламенцкі дзённік

# Экзамены для дэпутатаў

## Пасланне Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту папярэдне назначана на 19 красавіка

**Аб гэтым на пасяджэнні Савета Палаты прадстаўнікоў паведаміў яго старшыня, спікер ніжняй палаты парламента, Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА. Мерапрыемства адбылося на парозе адкрыцця шостай, вясновай сесіі Палаты прадстаўнікоў, якая распачне сваю работу ў аўторак, 2 красавіка.**

«Большасць з пытанняў, якія знаходзяцца ў Палаце прадстаўнікоў, іх 37, поўнасцю падрыхтаваны да разгляду на пленарным пасяджэнні. То-бок я хачу адзначыць, што мы ідзём згодна з графікам, які распрацаваны і зацверджаны намі. Але расслабляцца нельга, таму што парадак дня пастаянна дапаўняецца», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Узрастае патрабаванне да дэпутатаў у прагназаванні наступстваў прынятых рашэнняў.

Па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, на сесіі будзе разгледжана даволі шмат пытанняў, праца над якімі выклікае павышаную цікавасць насельніцтва і будзе адсочвацца ў прэсе. Такімі з'яўляюцца новая рэдакцыі Жыллёвага кодэкса, папраўкі ў Кодэкс аб шлюбе і сям'і, карэкціроўка законаў аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг, аб ахове працы і цэлы блок праектаў у сферы аховы здароўя.

«Большасць змяненняў прадыктавана практыкай прымянення законаў. Гэта значыць, амаль за кожнай навацыяй стаіць канкрэтны чалавечы лёс або няпростая жыццёвая сітуацыя. І вельмі важна, каб па ўсіх гэтых пытаннях былі прыняты эфектыўныя рашэнні», — канстатаваў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Таксама ў першым чытанні дэпутаты разгледзяць дапаўненні і змяненні ў некаторыя кодэксы: аб супрацьдзеянні допінгу ў спорце, абмежаванні грамадзян у наведванні віртуальных ігральных устаноў, Кодэкс аб зямлі.

Новы фактар для дэпутатаў — Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. «У Палаце прадстаўнікоў сёння ёсць дакументы, якія патрабуюць абавязковага ўліку многіх палажэнняў канцэпцыі», — адзначыў спікер ніжняй палаты парламента. Сярод іх — законапраекты аб дзяржаўнай інавацыйнай палітыцы і інавацыйнай дзейнасці, аб паштовай сувязі, аб персанальных даных.

«Ясна, што гэтае патрабаванне распаўсюджваецца абсалютна на ўсіх удзельнікаў заканадаўчага працэсу. Таму пастаянным камісіям трэба выбудоўваць сваю працу ў адпаведнасці з канцэпцыяй», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

На міжнароднай арэне акцэнт парламентарыямі будзе, як звычайна, зроблены на пытаннях бяспекі. Дэпутаты будуць працаваць над прасоўваннем беларускай рэзалюцыі па тэматыцы стратэгічнага прагназавання ў Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Месяц застаецца да міжнароднай канферэнцыі Групы падтрымкі Шаўковага шляху ПА АБСЕ.

А 17 чэрвеня ў Мінску адбудзецца сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. «Трэба прааналізаваць пытанні, якія мы раней разглядалі, і, канешне, напоўніць сур'ёзна парадак дня гэтай сесіі», — звярнуў увагу Уладзімір Андрэйчанка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Надвор'е

# УЖО НАВАТ НОЧЫ ЦЁПЛЫЯ

**У найбліжэйшыя дні пераважны ўплыў на надвор'е ў краіне будзе аказваць вобласць павышанага атмасфернага ціску, таму чакаецца ў асноўным без ападкаў, толькі ў апошні дзень сакавіка не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 0 да 6 цяпла, удзень — плюс 10—17 градусаў.

У апошні дзень месяца тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам франтальных раздзелаў, якія перамяшчаюцца з Балтыйскага мора. Уначы ў асобных раёнах, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 да плюс 7 градусаў, удзень у асноўным — плюс 8—14 градусаў, па паўднёвым усходзе краіны паветра прагрэецца да 16 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у першы дзень красавіка пахаладае. Уначы і раніцай месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя апады ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Наша тэрыторыя апынецца пад уплывам больш халоднай паветранай масы паўночных шырот. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да плюс 4 градусаў, удзень — 4—10 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Падпіска ў... музеі

## Выдавецкі дом «Звязда» прыняў удзел у фестывалі пошты

**У Гродне ён традыцыйны і праходзіць раз на квартал. Цяпер месцам правядзення стаў музей пошты, які нядаўна адкрыты ў Доме сувязі. На фестывалі рэспубліканскія і мясцовыя друкаваныя СМІ прадставілі свае выданні, рэкламную прадукцыю. Усе ахвотныя маглі аформіць падпіску і атрымаць падарунак.**



Часцей за ўсё фестываль праходзіць у цэнтры горада — на плошчы Савецкай альбо каля Дома сувязі. Выязджаў фестываль і ў новы мікрараён Альшанка. Музей пошты ўпершыню прыняў прадстаўнікоў выдавецтваў і рэдакцый. Тыя, хто наведаў фестываль, маглі пазнаёміцца з гісторыяй паштовай сувязі на Гродзеншчыне. Тут прадстаўлены сотні экспанатаў, некаторыя з якіх захаваліся з XIX стагоддзя.

Па словах вядучага інжынера Гродзенскага філіяла РУП «Белпошта» Ігара Павайбы, ідэя задзейнічаць новы музей у мэтах фестывалю будзе мець працяг і надалей. Такое пажаданне выказалі і многія наведвальнікі. Дарэчы, некаторыя прыйшлі, пачуўшы музыку. Аб фестывалі інфармавалі і работнікі філіяла, якія сустракалі на ўваходзе. Прадстаўнікі Гродзенскага аддзялення «Белпошты» дапамагалі аформіць падпіску. Свае выданні, а іх даволі нямала, прадставіў Выдавецкі дом «Звязда». У падарунак падпісчыкі маглі атрымаць календары, блакноты, кубкі і нават бейсболкі з лагатыпам «Звязды».

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

# Сталічны ЧАС

● У Смалявічах для мінчан плануецца пабудаваць эксперыментальны пяціпавярховы васьміпад'езны жылы дом з электраплітамі, арыенціровачна на 160 кватэр. Папярэдняя інфармацыя па рэалізацыі Указа № 103 размешчана на сайце Мінгарвыканкама, паведамляе БелТА. Дакумент уступіў у сілу 21 сакавіка гэтага года. Паводле яго, жыхары сталіцы, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, могуць атрымаць жыллё ў горадзе-спадарожніку. Будаўніцтва будзе ажыццяўляцца ў 2019—2020 гадах долевым спосабам, забудоўшчыкам выступіць УКБ Мінаблвыканкама. Ва ўпраўленні жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама праінфармавалі, што заяву ў адміністрацыю свайго раёна Мінска грамадзяне маюць права падаваць незалежна ад даты пастаноўкі на ўлік. Фарміраванне спісаў дольшчыкаў ажыццяўляецца па заяўляльным прынцыпе пад кантролем Мінскага гарвыканкама на працягу трох месяцаў з даты апублікавання інфармацыі аб жылым доме.

● Дзяржаўтаінспекцыя Мінска сёння праводзіць Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху «Бяспраўніку» не месца за рулём!», паведамілі БелТА ў ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама. Асаблівую ўвагу аддадуць прафілактыцы аварый па віне кіроўцаў, якія не маюць або пазбаўлены права кіравання транспартнымі сродкамі. За студзень — люты ў сталіцы выяўлена больш за тысячу фактаў такіх парушэнняў. Па віне бяспраўнікаў адбылося два ДТЗ, у якіх адзін чалавек загінуў і шэсць атрымалі траўмы.

# Галандскія коні для нашай пушчы

**Міністэрства лясной гаспадаркі і Дзяржаўная служба лясоў Нідэрландаў наладзяць узаемадзеянне ў сферы прыродаахоўнай сферы. Першым знакавым праектам можа стаць перадача дзікіх коней Рэспубліканскаму ландшафтнаму заказніку «Налібоцкі». Адпаведная дамоўленасць была дасягнута падчас афіцыйнага візіту ў нашу краіну дэлегацыі з Нідэрландаў, паведамляе прэс-служба Мінлясгаса.**

Гаворка, у прыватнасці, ідзе пра супрацоўніцтва ў галіне найноўшай прыродаахоўнай канцэпцыі — рэвайлдынгу. Яна мае на ўвазе паэтапнае аднаўленне характэрных для рэгіёна высокапрадукцыйных экасістэм шляхам вяртання буйных жывёл у месцы іх спрадвечнага арэала.

Першымі такімі жывёламі стануць дзікія коні. Нідэрланды плануюць перадаць Беларусі больш за 50 асобін гэтага віду. Чакаецца, што жывёлы прыбудуць у Беларусь у пачатку лета, пасля чаго распачнецца іх адаптацыя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Індыя збіла спадарожнік, які знаходзіўся за 300 км ад Зямлі



Прэм'ер-міністр Індыі Нарэндра Модзі заявіў, што паспяховае выпрабаванне такога тыпу зброі — гістарычная падзея. Ён таксама павіншаваў спецыялістаў індыйскай арганізацыі абаронных даследаванняў і распрацовак (DRDO), якія займаліся стварэннем ракеты. У тэлезвароце да нацыі Модзі заявіў, што Індыя стала чацвёртай краінай у свеце, якой удалося прымяніць антыспадарожнікавую зброю. «Толькі тры краіны ў свеце маюць такую магчымасць — ЗША, Расія і Кітай. Гэта момант гонару для Індыі, — сказаў Модзі. — Індыя можа абараніць сябе на зямлі, вадзе, у паветры, а цяпер і ў космасе». Прэм'ер-міністр расказаў, што Індыя правяла выпрабаванні антыспадарожнікавай сістэмы A-SAT у рамках місіі Shakti. Зброя знішчыла цэль праз тры хвіліны, а сам спадарожнік знаходзіўся за 300 км ад Зямлі. Нарэндра Модзі таксама ў сваім звароце адзначыў, што выпрабаванне не парушае міжнародныя дагаворы. Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што місія Shakti не накіравана супраць іншых краін. Аб распрацоўцы ўласнай антыспадарожнікавай сістэмы абвясцілі ў 2010 годзе кіраўнік DRDO Віджай Кумар Сарасват. Праз два гады Індыя паспяхова пратэсціравала балістычную ракету «Агні-5», пасля чаго Сарасват заявіў, што арганізацыя стварыць антыспадарожнікавую зброю.

## Брытанская палата абшчын адхіліла ўсе восем варыянтаў брэксіту



Парламент Брытаніі яшчэ раз прадэманстраваў, што знаходзіцца ў тупіку ў дачыненні да формаў выхаду краіны з Еўрасаюза: дэпутаты адхілілі ўсе восем вынесеных на абмеркаванне варыянтаў дзеянняў у дачыненні да брэксіту, перадае Бі-бі-сі. Варыянты, прапанаваныя самімі дэпутатамі, уключалі ўвесь спектр магчымых дзеянняў — ад рашучага і хуткага разрыву з ЕС да адмены выхаду — і ні адзін з іх не набраў нават аднаснай большасці. Гэта значыць, супраць кожнага з варыянтаў прагаласавала больш дэпутатаў, чым за яго. Больш за ўсё галасоў сабралі прапановы аб тым, каб вынесці любое пагадненне з ЕС на рэферэндум (268 галасоў), аб мытным саюзе з ЕС (264 галасы) і прапанова апазіцыйнай Лейбарысцкай партыі аб мытным саюзе і цесным супрацоўніцтве з ЕС на іншых кірунках (237 галасоў). Палата плануе працягнуць пошукі прымальнага для большасці варыянта брэксіту 1 красавіка. Дэпутат, які прапанаваў такі алгарытм дзеянняў, сэр Олівер Летвін, да галасавання выказаў здагадку, што ў панядзелак дэпутаты абмяркуюць ужо два-тры найбольш папулярныя варыянты з тых, што былі вынесены на галасаванне, і паспрабуюць выбраць адзін. Нават калі парламент знойдзе агульнае рашэнне, яно не будзе мець сілы закона або загада ўрада. Але Летвін спадзяецца, што ўрад усведамляе неабходнасць прыняць менавіта той варыянт брэксіту, за які большасць дэпутатаў.

## У Брунеі мяркуюць увесці смяротнае пакаранне праз збіццё камянямі



Праваабарончая арганізацыя Amnesty International заклікала ўлады Брунея перагледзець планы, згодна з якімі на наступным тыдні шлюбная здрада і гомасексуальныя сувязі будуць караць ў султанаце смяротным пакараннем праз збіццё камянямі. Як паведамляе арганізацыя, апавяшчэнне пра дапаўненні да крымінальнага кодэкса, якія ўступаюць у сілу 3 красавіка, размешчана на сайце генпракуратуры Брунея. Новыя віды пакарання, згодна з нормамі шарыяту, прадугледжваюць не толькі збіццё камянямі за адзюльтэр і аднаполы секс, але і ампутацыю канечнасцяў у асуджаных за крадзеж. «Бруней павінен неадкладна прыпыніць рэалізацыю гэтага праекта і перагледзець крымінальны кодэкс у адпаведнасці з абавязацельствамі ў галіне правоў чалавека. Міжнародная супольнасць павінна самым рашучым чынам асудзіць спробу Брунея прымяніць на практыцы гэтыя суровыя пакаранні», — гаворыцца ў заяве Amnesty International. Праваабаронцы адзначаюць, што Бруней падпісаў, але не ратыфікаваў Канвенцыю ААН супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных, ці якія прыніжаюць годнасць, відаў абыходжання і пакарання. Хоць законы краіны прадугледжваюць смяротнае пакаранне, на практыцы яго прысуджаюць вельмі рэдка: апошні раз прысуд да вышэйшай меры пакарання быў вынесены ў 2017 годзе за злачынствы, звязанае з наркотыкамі.

# ЗБІРАЮЦЬ МІКРАСКОПЫ І КУЮЦЬ ЖАЛЕЗА

## Як беларускі знаходзяць сябе ў нетыповых прафесіях

**«Выбіраць прафесію трэба не па прэстыжнасці і даходнасці. Задайце сабе пытанне: ці застанецца гэта справа вам цікавая, калі за яе не будуць плаціць і калі вы будзеце жыць на ненаселеным востраве? Калі двойчы адказваеце «так», гэта ваша», — раіць каваль Аксана КІРЫЛЮК. Яна ведае, пра што кажа: сама некалі вучылася на эканаміста-міжнародніка, але на нелюбімай рабоце доўга не затрымалася.**

Паводле статыстыкі, большасць беларусак заняты ў сферы аховы здароўя, сацыяльных паслуг, адукацыі, гандлю, фінансаў. Але гэта не адзіныя прафесійныя шляхі для жанчыны.



Выстаўка «Яе справа» адкрыта да 10 красавіка.
У аб'ектыве фатографа Яўгена Ацецкага аказаліся работніцы прадпрыемстваў Мінска, Салігорска, Навапалацка, Гомеля і іншых гарадоў.

### «Баялася, што мяне чакаюць брудныя цэхі»

**Галіна КУРАЧКІНА** працуе электразваршчыкам ручной зваркі на Гомельскім хімічным заводзе. У прафесію яна прыйшла 38 гадоў таму — выпадкова.



У цэнтры — каваль Аксана КІРЫЛЮК.

— Калі я паступала ў вучылішча, збіралася быць апаратчыкам. Але дзяўчына ў прыёмнай камісіі прапанавала: «Не хочаш пайсці на зваршчыка?» Яна сама ім працавала і лічыла прафесію перспектыўнай.

Спачатку не ўсё лёгка давалася. Канструкцыі пасля зваркі развальваліся, даводзілася перарабляць. Галіна складанасцяў не баялася: праца падабалася, таму нават думак не было яе кінуць.

На сваім заводзе яна адзіная жанчына-зваршчык. «У мужчынскім калектыве адчуваю сябе выдатна», — усміхаецца. І дадае: калі па святах прыходзіць на работу ў сукенцы, калегі, якія прывыклі бачыць яе ў спецадзенні, не пазнаюць.

Дочкі Галіны дынастыю зваршчыц не працягнулі. Жанчына ставіцца да гэтага з разуменнем: да работы павінна ляжаць душа.

**Оптык-механік Галіна ЧУГАЕВА** таксама трапіла ў прафесію воляй лёсу. Пасля школы не паступіла адразу ва ўніверсітэт і, каб не губляць час, пайшла на 10-месячныя курсы. Хвалявалася, што на рабоце яе чакаюць брудныя шумныя цэхі, але ўсё аказалася не так страшна.

На прадпрыемстве «Пеленг» Галіна збірае метэаралагічнае абсталяванне, касмічныя датчыкі, мікраскопы. «Мне цікавы сам працэс», — тлумачыць.

Веданне механікі, якое дзяўчына атрымала на працы, карыснае і ў паўсядзённым жыцці. «Дома магу адрамантаваць усё», — кажа Галіна.

### Калі жанчын дапусцяць у вадалазы?

Кіроўца-выпрабавальнік, токар, фрэзероўшчык, ляснічы... Гісторыі беларусак з нетыповымі для жанчын прафесіямі расказвае фотавыстаўка «Яе справа», якая адкрылася ў сталічным культурным цэнтры «Корпус». Яна стала часткай праекта «Занятасць, прафесійная адукацыя і навучанне ў Беларусі», што фінансуецца Еўрапейскім саюзам.

— Мы хочам паказаць моладзі, якія кар'ерныя шляхі існуюць, бо межы паміж традыцыйна мужчынскімі і жаночымі прафесіямі сціраюцца, — адзначае **кіраўнік праекта Леа ОРА.**



Оптык-механік Галіна ЧУГАЕВА.

Летась Міністэрства працы і сацабароны склала прагноз патрэб рынку працы на найбліжэйшыя пяць гадоў. Чакаецца, што попытам з боку наймальнікаў будуць карыстацца рабочыя прафесіі ў сферы прамысловасці і будаўніцтва. У топе таксама аказалася інжынеры розных кірункаў.

Аднак у Беларусі не ўсе спецыяльнасці даступныя спадарыням. 181 прафесія (сярод іх шахцёр, вадалаз, кіроўца міжнароднага аўтобуса) — у спісе забароненых для жанчын. Каб штосьці з яго выключыць, павінны палепшыцца ўмовы працы.

— Узровень бяспекі на вытворчасці павышаецца, таму пералік паступова становіцца меншым: не так даўно ў ім было больш за 250 прафесій, — заўважае **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.** — Спіс рыхтуе наша міністэрства, але ініцыятыва па выключэнні пэўнай спецыяльнасці можа ісці і ад прадпрыемстваў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

### Кампетэнтна

### Партрэт спецыяліста будучыні

**Ці паспявае сістэма падрыхтоўкі кадраў рэагаваць на новыя выклікі? Рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Валерый ГАЛУБОЎСКІ упэўнены, што для гэтага ёсць усё неабходнае:**

— Па-першае, мы наладзілі ў сферах прамысловасці і будаўніцтва шчыльную працу пры міністэрствах, стварылі сектаральныя саветы, куды ўвайшлі прадстаўнікі найбольш устойлівых прадпрыемстваў. Задача гэтых саветаў — фарміраваць прафесійны партрэт спецыяліста для будучай эканомікі, бо толькі кампаніі могуць сказаць, якія функцыі з'явяцца ў работніка з прыходам новых тэхналогій. Па-другое, на падставе гэтых патрабаванняў мы ўносім змены ў змест адукацыйных праграм і ствараем па краіне сетку рэсурсных цэнтраў, аснашчаных высокатэхналагічным абсталяваннем. Напрыклад, па профілі машынабудавання ёсць рэсурсныя цэнтры ў Мінску, Барысаве, Гомелі, ствараецца ў Оршы. Мы пайшлі такім шляхам, бо разумеем, што ў кожную навучальную ўстанову купіць сучаснае абсталяванне не паспеем — пакуль у дзясятую будзем набываць, у першай ужо састарэе.

Ёсць гнуткі механізм абнаўлення адукацыйных праграм. Па меры таго як з'яўляецца новая тэхналогія, мы карэктуем асобныя раздзелы ў апаратыўным рэжыме. Сёлета дамовіліся пра штосьці — ужо з наступнага года гэта будзе вывучацца. Калі на нашай пляцоўцы няма патрэбнага абсталявання, студэнт можа прайсці практыку на прадпрыемстве. Нарматыўная база дазваляе гэта зрабіць. Мы можам ва ўнісон развівацца з рэальным сектарам эканомікі ці нават апярэджваць яго, а не даганяць.

Фота да матэрыялу «Шэдэўр на талерцы», апублікавана ва ўчарашнім нумары, зроблены ў працэсе відэаздымкі праекта ЛІФТ Асацыяцыі абароны інтэлектуальнай уласнасці «БелБрэнд».

Праект ЛІФТ прызначаны для падтрымкі і прасоўвання беларускай моладзі.

### РАЗМОВЫ З ТОЛКАМ

**У Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах адбудуцца чарговыя прамыя тэлефонныя лініі 30 сакавіка. З 9.00 да 12.00 у суботу іх правядуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарвыканкама Анатоль Аляксандравіч СІВАК. Тэл. 8 017 222 44 44.


**Закрытое акционерное общество «На Уманской», расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 55, сообщает о выплате дивидендов по акциям:**

| | |
|---|---|
| Дата принятия решения общего собрания акционеров, в соответствии с которым осуществляется выплата дивидендов по акциям | 29.03.2019 г. |
| Дивиденды, начисленные на одну акцию по результатам работы за 2018 г. | 7 руб. 40 коп. на 1 простую акцию |
| Срок и порядок выплаты дивидендов по акциям по результатам работы за 2018 г. | Не позднее 30.04.2019 г. Перечисляются одновременно всем акционерам – владельцам простых акций, пропорционально количеству принадлежащих им акций |

УНП 101085067 Общее собрание акционеров

**ОАО «КОНДИТЕРСКАЯ ФАБРИКА «СЛОДЫЧ» осуществляет реализацию следующей техники:**

**✓ ТРАКТОР МТЗ 82.1,**
1992 года выпуска, по цене 9 600,00 руб. без учета НДС.

**✓ АВТОМОБИЛЬ MAZDA 6,**
2004 года выпуска, по цене 6 760,00 руб. без учета НДС.

**Телефоны для справок:**
**8 (017) 398 97 37; + 375 29 355 20 67; + 375 29 121 0 441.**
**Место расположения объектов:**
**г. Минск, ул. Радиальная, 54/2.** УНП 100129695

**ОАО «Объединенная дирекция строящихся объектов» в лице ликвидатора ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК»**

проводит торги по продаже недвижимого имущества ОАО «Объединенная дирекция строящихся объектов».

Продавец: ОАО «Объединенная дирекция строящихся объектов» в лице ликвидатора ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК».

Организатор торгов: ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ», 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27. Руководитель организатора электронных торгов – Шигалева Ирина Викторовна; тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690-54-09, WWW.BELTORGI.BY.

Публичные торги в электронной форме в процедуре ликвидации (далее – электронные торги) будут проведены: 30 апреля 2019 г., в 9.00, на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY, окончание – 30 апреля 2019 г., 17.00.

Заявки принимаются с 29 марта 2019 г., 09.00 до 29 апреля 2019, 17.00.

Шаг аукциона 5 %.

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 17.00 29 апреля 2019 г. перечислить задаток по выбранному лоту. Расчетный счет для перечисления задатка BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

2. Далее подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY.

3. Направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее — в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY). Задаток должен быть внесен до подачи заявки на участие в электронных торгах. Задаток вносится за каждый лот в размере 10 % от начальной стоимости предмета торгов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат на организацию и проведение торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения на основании представленного организатором торгов извещения о возмещении затрат.

Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Срок оплаты предмета торгов: не позднее 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Более подробная информация о проведении торгов на сайте WWW.BELTORGI.BY.

| № п/п | Предмет торгов | Общая площадь, кв. м | Адрес | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС | Шаг торгов (5 %), бел. руб. | Сумма задатка (10 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Склад | 39,8 | г. Минск, ул. Шатько, 24/4 | 20 623,35 | 1 031,17 | 2 062,34 |
| 2 | Здание склада | 249 | г. Минск, ул. Шатько, 24/2 | 127 066,42 | 6 353,32 | 12 706,64 |
| 3 | Здание склада с пристройкой | 258 | г. Минск, ул. Шатько, 24/3 | 138 819,51 | 6 940,98 | 13 881,95 |

**ИЗВЕЩЕНИЕ о снятии объекта с торгов**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) сообщает о снятии с аукциона, назначенного на **01.04.2019 г.,** здания насосной станции общей площадью 142,0 кв. м, инв. № 600/С-100407, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623684204601001077 площадью 0,0446 га по адресу: Минская область, Минский район, Михановичский с/с, д. Михановичи, ул. Заречная, 21А.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 28.02.2019 г.

УНП 690324015




## АБЯЦАНКІ-ЦАЦАНКІ...

Вось некалі раней дык добра было: пасля школы атрымаў спецыяльнасць, знайшоў работу і працуй сабе — гадамі ці нават дзесяцігоддзямі. Цяпер жа іншая мода: з усіх бакоў гавораць, што ўсё трэба мяняць — жонак-мужоў, адрасы, кватэры, а ўжо работу — дык кожныя пяць гадоў! Некаму гэта, можа, і даспадобы, а некаму — не. Я вось дакладна з ліку апошніх, таму, дзякуй богу, паспела яшчэ змяніць працу на заслужаны адпачынак.

Але ж тут размова пра маладых. Цяжка ім ва ўсіх адносінах, бо трэба яшчэ і дамы будаваць, і дзяцей выхоўваць, і дровы садзіць. А за якія, прабачце, грошы? Вось і даводзіцца ім звальняцца з аднаго месца, уладкоўвацца на новае, зноў шукаць і, бывае, знаходзіць...

Суседскі Юрык, напрыклад, у дальнабойшчыкі падаўся. Нялёгкая гэта праца, але ж свае пяцьсот зялёных «рублёў» хлопец штомесяц мае, па свеце раз'язджае, шмат што бачыць. Некалі б яшчэ і розных дэфіцытаў сваім панавозіў, а цяпер, казаў, ужо не: «Што тут Кітай, што там...»

Але ж Юра ўсё роўна задаволены — і работай, і сваім напарнікам. Яны з ім за правіла ўзялі: у рэйс выязджаюць рана, з сабой бяруць «тармазкі», каб ні часу, ні грошай лішніх не траціць...

Дык вось у той раз перад ад'ездам да Юрыка зайшла сястра. Сказала, што ўсякай смакаты нарабіла (напярэдадні свінчо закалолі), і насклала ў розныя слоікі-каробачкі, што пакет з імі паставіла ў сенцах.

— Пайшлі — пакажу, каб ты ведаў, — прапанавала брату.

— А што там глядзець? — буркнуў той. — Забяру ды паеду.

Тані трохі крыўдна было ад гэтай няўвагі, але ж што ты будзеш рабіць? Схадзіла ў склеп, убачыла там, што морква псуецца. Набрала яе ў пакет, каб горшую скаціне скарміць...

А Юрык тым часам ужо сабраўся, пазваніў напарніку: маўляў, ты з сабой нічога не бяры, хіба тэрмас чаю, усё астатняе ўжо ёсць. А потым выйшаў у сенцы, падхапіў досыць важкі «тармазок», укінуў яго ў машыну і...

«Сістэма дзяржаўнага сацзаказу стартавала ў Беларусі пяць гадоў таму, — паведаміў Валерый Кавалькоў. — У 2014-м з'явіліся першыя дагаворы. Гэта мера дазваляе вырашаць складаныя сацыяльна значныя задачы шляхам пошуку новых паслуг і пашырэння колькасці арганізацый, якія могуць іх аказваць. За гэты час было заключана 280 дагавораў па аказанні паслуг дзяржаўнага сацыяльнага заказу. У першы год мы пачыналі з 34, і гэтая лічба пастаянна расце. Прасубсідавана больш за 500 ставак работнікаў недзяржаўных камерцыйных арганізацый, у выніку амаль 10 тысяч беларускіх грамадзян атрымалі сацыяльныя паслугі ў рамках сацыяльнага заказу».

«Падчас канферэнцыі былі прадэманстраваны вынікі рэалізацыі 22 праектаў у такіх напрамках, як «Сацыяльная сфера» і «Устойлівае рэгіянальнае развіццё», — расказаў каардынатар праграмы **Дзмітрый КАРПІЕВІЧ.** — Было адзначана шмат цікавых тэндэнцый: гэта і нацыянальныя праекты, і рэгіянальныя, і нават мясцовыя. Яны датычыліся сацыяльных інавацый, а гэта і выкананне сацыяльнага дзяржаўнага заказу, і праца з дэменцыяй, і развіццё сацыяльнага прадпрымальніцтва, і шэраг іншых тэм па ўстойлівым развіцці».

Усе праекты ў рамках гэтай праграмы накіраваны перш за ўсё на садзейнічанне рэгіянальнаму развіццю. Сярод іх можна назваць і стварэнне турыстычнага кластара ў Магілёўскай вобласці, і развіццё сеткавага ўзаемадзеяння паміж Гродзенскай і Гомельскай абласцямі, і ўкараненне энергаэфектыўных падыходаў і менеджменту на тэрыторыі трох раёнаў — Чавускага, Вілейскага і Веткаўскага, і шэраг іншы праектаў.

Праграма падтрымкі Беларусі «Пераадольваючы межы» рэалізуецца з 2002 года Дортмундскім міжнародным адукацыйным цэнтрам сумесна з Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтрам імя Ёханеса Рау па даручэнні Федэральнага міністэрства эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (BMZ) і Германскага таварыства міжнароднага супрацоўніцтва (GIZ). Яна накіравана на падтрымку нямецка-беларускіх ініцыятыў, якія, маючы сваім адпраўным пунктам гуманітарныя адносіны, перараслі ў партнёрскую праектную працу. За восем этапаў праграмы рэалізавана больш за 270 праектаў. Сёлета запланаваны чарговы конкурс ініцыятыў, дзе асноўную ўвагу будуць аддаваць садзейнічанню рэалізацыі Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Беларусі ў кантэксце глабальных мэт Парадку-2030, прынятых ААН.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# І АСАБІСТЫ ДЭПУТАЦКІ ЎКЛАД

**На сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў галоўным пытаннем для абмеркавання стала падрыхтоўка да 75-й гадавіны вызвалення Беларусі і Перамогі над фашызмам.**




Сярод удзельнікаў мерапрыемства былі і кіраўнікі выканаўчай улады з рэгіёна, пошукавікі, краязнаўцы, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.

**Старшыня Віцебскага аблсавета Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** патрабаваў, каб усім ветэранам Вялікай Айчыннай вайны была аказана дапамога, калі гэта неабходна. Кожны заслугоўвае павагі і клопату не толькі напярэдадні чарговага святкавання.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама Генадзь ЯГОРАЎ** паведаміў, што колькасць ветэранаў ВАВ на пачатак сакавіка складала 877. І гэта на 8,3 % меней, чым у пачатку года. Сыходзяць з жыцця і асобы, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, — 3919 (на 2,2 % менш)...

Мясцовыя ўлады ў глыбінцы, вядома, стараюцца падтрымліваць ветэранаў. І шукаюць новыя формы праяўлення клопату. Напрыклад, у Бешанковіцкім, Дубровенскім, Лепельскім, Мёрскім, Пастаўскім раёнах прыняты рашэнні выканкамаў аб вызваленні (у парадку выключэння) ветэранаў ад аплаты за сацыяльныя паслугі, якія аказваюцца тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання. У Шаркаўшчынскім раёне выдаткі па аплаце сацыяльных паслуг, якія аказваюцца ветэрану ВАВ, пакрывае сельскагаспадарчае прадпрыемства.

Старшыня аблсавета прывёў прыклады фармалізму пры рабоце са зваротамі ветэранаў. Указаў, што ўсе просьбы, калі не патрабуюцца вялікія фінансавыя сродкі, павінны выконвацца як мага хутчэй. Дарэчы, тыя, каму мы абавязаны незалежнасцю, за рэдкім выключэннем, людзі сціплыя. Была, у прыватнасці, заяўка ад старых на рамонт электраправодкі, пяць — пячнога ацяплення, шэсць просьбаў адрамантаваць плот, ганак.

З павагай адносяцца і да памяці тых, хто загінуў, вызваляючы Віцебшчыну. Дарэчы, сёлета плануецца завяршыць работу па зверцы прозвішчаў на вайсковых могілках. Добрай традыцыяй стала інфармаванне сваякоў і нашчадкаў аб занясенні прозвішча на мемарыяльную пліту. І нярэдка потым нават здалёк прыязджаюць, каб наведаць месца пахавання блізкіх.



З захаваннем воінскіх пахаванняў праблем няма. Але некаторыя помнікі, якія ўвекавечваюць памяць аб подзвігу савецкіх грамадзян у гады Вялікай Айчыннай, не знаходзяцца на ўліку. **Дэпутат Віцебскага раённага Савета, вядомы краязнаўца-гісторык Мікалай ПІВАВАР** падзяліўся вопытам даследавання тэмы. Па яго ініцыятыве праведзена работа па зборы звестак аб помніках вайсковай славы і памятных мясцін, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной, іншымі ваеннымі канфліктамі. Аналагічнае плануецца ажыццявіць і ў іншых раёнах.

Агучылі і тэму рамонту помнікаў. **Старшыня Гарадоцкага райвыканкама Пётр КАРАБАЧ** расказаў пра тое, што робіцца і будзе. Дарэчы, у раёне ўжо адсвяткавалі юбілей вызвалення. Ён нагадаў аб унікальным помніку, які быў устаноўлены ў чэрвені 1970 года ва ўрочышчы вёскі Шчалбова. Тут у былым цэнтры партызанскай зоны быў адкрыты помнік «Гаспадар лесу». Ён уяўляе сабой скульптуру партызана вышынёй 5,5 метра. Ёсць і стэла з надпісам-інфармацыяй і бетонная пліта на ўзвышшы, якая імітуе ўваход у партызанскую зямлянку. Пастаць партызана нагадвае волата, які сціскае ў руках аўтамат. Яна поўная сілы і годнасці, падкрэслівае, што партызан заўсёды быў гаспадаром і застаецца ім на роднай зямлі. Аўтар помніка — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Анатоль Кавалёў. Старшыня аблсавета прапанаваў народным выбраннікам, дапамагчы рублём уаднаўленні помніка.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

КОНКУРС

# 1000 еўра — за дружалюбнасць да экалогіі

**Другі раз у Беларусі стартуе нацыянальны этап міжнароднага конкурсу «Экалагічна дружалюбны фермер Балтыйскага рэгіёна» (Baltic Farmer of the Year Award).**

Конкурс больш як дзесяць гадоў праводзіць Сусветны фонд дзікай прыроды (WWF), але беларускія сельгасвытворцы змаглі далучыцца да яго ўпершыню толькі летась. Ініцыявалі правядзенне конкурсу ў нашай краіне Цэнтр экалагічных рашэнняў (Беларусь) і Кааліцыя «Чыстая Балтыка» (Швецыя).

Ключавая ідэя гэтай ініцыятывы — папулярызаваць перадавыя практыкі сельскай гаспадаркі, якія з'яўляюцца дружалюбнымі для Балтыйскага рэгіёна. Ёсць і яшчэ адна мэта — падтрымаць фермераў і вытворцаў, якія імкнуцца змяншаць экалагічную нагрузку. Гэта важна, бо сельская гаспадарка — адна з асноўных крыніц забруджвання навакольнага асяроддзя, тлумачаць арганізатары. Асаблівая часта вада забруджваецца ўгнаеннямі з утрыманнем азоту і фосфару, што выклікае эўтрафікацыю — «цвіценне» вадаёмаў (мясцовых і «агульных», напрыклад Балтыйскага мора).

— Мы спадзяёмся, што правядзенне конкурсу ў Беларусі стане важным крокам для прасоўвання і падтрымкі тых фермерскіх гаспадарак, якія аддаюць увагу экалагічным пытанням у сваёй рабоце, — падкрэслівае **дырэктар Цэнтра экалагічных рашэнняў Яўген ЛАБАНАЎ.**

У конкурсе могуць удзельнічаць прадстаўнікі фермерскіх і іншых невялікіх сельскагаспадарчых вытворчасцяў, якія знаходзяцца ў зоне вадазбору Балтыйскага мора ў Беларусі (Гродзенская, Віцебская і частка Мінскай і Брэсцкай абласцей). Заяўкі на конкурс прымаюцца да 13 красавіка 2019 года.

У 2018 годзе галоўны прыз — 1000 еўра — атрымаў фермер з Дзяржынскага раёна Канстанцін Чычыра, які вырошчвае арганічныя клубніцы. Два іншыя каштоўныя падарункі ад партнёраў конкурсу атрымалі ягадныя гаспадаркі «СідСад» і «Доктар Шарэц», асноўная культура якіх — буякі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ГРАМАДСКАЕ АБМЕРКАВАННЕ

# Усё аб экатавары — у некалькі клікаў

## У Беларусі прапануюць абмеркаваць парадак фарміравання рэестра вытворцаў арганічнай прадукцыі

**Праект пастановы Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі «Аб фарміраванні і вядзенні рэестра вытворцаў арганічнай прадукцыі» вынесены на грамадскае абмеркаванне на Прававым форуме Беларусі, паведамляе БелТА.**

Згодна з праектам дакумента, вядзеннем рэестра будзе займацца Беларускі дзяржаўны інстытут стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС). Рэестр будуць фарміраваць і весці на аснове інфармацыі рэестра Нацыянальнай сістэмы пацвярджэння адпаведнасці. У яго будуць уключаны найменне і месцазнаходжанне вытворцы арганічнай прадукцыі, які з'яўляецца юрыдычнай асобай; прозвішча, імя, імя па бацьку (пры яго наяўнасці), месца жыхарства згодна з рэгістрацыяй фізічнай асобы (у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка), які ажыццяўляе вытворчасць арганічнай прадукцыі; найменне арганічнай прадукцыі; абазначэнне сертыфіката адпаведнасці і тэрмін яго дзеяння.

«Органы па сертыфікацыі забяспечваюць дакладнасць і своечасовасць падачы інфармацыі для ўключэння ў рэестр. Звесткі даюцца органам па сертыфікацыі ва ўпаўнаважаную арганізацыю (БелДІСС) па электронных каналах сувязі ў дзень рэгістрацыі сертыфіката адпаведнасці», — гаворыцца ў абгрунтаванні да праекта пастановы.

БелДІСС будзе ўключаць даныя ў рэестр і забяспечваць адкрыты доступ да іх. Звесткі з рэестра будуць размяшчацца на сайце Дзяржстандарта. Пастанова ўступіць у сілу адначасова з законам аб вытворчасці і абароце арганічнай прадукцыі — з 18 лістапада 2019 года.

Арганізатар грамадскага абмеркавання — Дзяржстандарт. Свае заўвагі і прапановы можна выказаць у адмысловай тэме на Прававым форуме Беларусі з 25 сакавіка да 5 красавіка ўключна.

# ПРОДУКЦИЯ С ПРИСТАВКОЙ «BIO»

**В ноябре минувшего года в Беларуси был принят закон «О производстве и обращении органической продукции». Его положения вступят в силу в середине нынешней осени. И пока правительство работает над созданием необходимых нормативных документов для реализации принятого законодательства, специалисты обсуждают перспективы развития органического земледелия в нашей стране.**




Вопрос не такой простой, как кажется на первый взгляд. С одной стороны раскрученный бренд и растущий спрос на органическую продукцию дает ей бесспорное преимущество не только на нашем отечественном рынке, но и за рубежом. По данным Министерства сельского хозяйства и продовольствия, Беларусь может получать дополнительно около 1 миллиона долларов от экспорта таких продуктов питания.

Другая сторона вопроса — какие риски необходимо учесть белорусским производителям перехода на рельсы органического производства?

## МИРОВАЯ ПРАКТИКА

На мировом рынке производство органических продуктов питания занимает около 10 % от общего объема производства сельскохозяйственной продукции. Ежегодно увеличиваются площади, на которых производятся экологически чистые продукты питания. Сейчас это 47 миллионов гектаров, большая часть их находится в теплых странах — Австралии (30 %) и в Аргентине (12 %).

Объем реализации органической продукции на мировом рынке сейчас превышает 100 миллиардов долларов. В 2004 году был создан «Европейский план действий по органическому продовольствию и органическому земледелию», который стал ключевым инструментом европейской политики в области органического сельского хозяйства. Но, несмотря на рост объемов производства органической продукции в странах Западной Европы, ее доля в общем объеме продаж продуктов питания составляет всего лишь от 1 до 10 процентов.

Ни для кого не секрет, что органическое производство достаточно трудоемко и затратно. Например, только для того, чтобы привести в соответствие с международными требованиями 1 гектар земли для производства органической продукции животноводства, требуется в течение трех-пяти лет затратить как минимум около 900 евро. А если учесть все риски, связанные с неурожаем и трудоемкость процессов выращивания, то становится понятным, почему западноевропейские фермеры, несмотря на растущий спрос, идут на производство такой продукции, тщательно взвесив все «за» и «против».

## ЧТО ИМЕЕМ В БЕЛАРУСИ?

В Национальной стратегии устойчивого социально-экономического развития Беларуси на период до 2030 года в качестве одного из приоритетов производства АПК предусмотрен рост доли земель для производства органической продукции в общей площади сельскохозяйственных угодий до 3-4 %. Развитие производства органической продукции предусмотрено и Программой социально-экономического развития Республики Беларусь на 2016—2020 годы. Об этом идет речь и в Доктрине национальной продовольственной безопасности Беларуси до 2030 года.

Закон «О производстве и обращении органической продукции» откроет новые возможности для развития этого направления в нашей стране.

По мнению председателя **Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александра ПОПКОВА,** принятие закона своевременно и необходимо.

— Мы отвечаем на запрос населения и даем возможность аграриям производить продукцию, которая будет востребована как на отечественном рынке, так и за пределами Беларуси. Пока этим делом могут заниматься небольшие сельхозпредприятия и фермерские хозяйства. Для глобального перехода АПК на производство органической продукции необходим определенный промежуток времени и реализация системы мер. В первую очередь требуется привлечь инвестиции в модернизацию производства, в механизацию рабочих процессов, в сооружения по хранению и переработке органических удобрений и так далее. Важное направление — подготовка кадров: без высококвалифицированных специалистов реализовать поставленные задачи будет невозможно.

По словам Александра Попкова, необходимо учитывать и особенности производства такой продукции на территории Беларуси, принимая во внимание факторы, влияющие на формирование урожая: температуру воздуха, осадки, мощность солнечной радиации. Например, анализ параметров основных метеофакторов по географической широте столиц Беларуси, Германии, Франции и Польши показывает, что период вегетации в этих странах на два месяца больше, а температура воздуха на 10 градусов выше.

К тому же, на наших дерново-подзолистых почвах очень низкий уровень естественного плодородия: 23 % почв с низким содержанием фосфора, 31 % — с низким содержанием калия, 11 % почв — с низким содержанием гумуса. Эти и другие природно-климатические условия оказывают решающее влияние на урожай.

В то же время принятие закона «О производстве и обращении органической продукции» будет содействовать занятости сельского населения по производству экологически чистых продуктов питания, в том числе и по созданию фермерских хозяйств.

Органическое сельское хозяйство, безусловно, новая и достаточно перспективная рыночная ниша для белорусских производителей. В настоящий момент у нас сертифицировано около 1,5 тысячи гектаров сельскохозяйственных земель. Производством органических продуктов занимаются более 20 отечественных субъектов хозяйствования, включая фермерские и личные подсобные хозяйства.

Что же касается наличия спроса населения на органическую продукцию, то анализ социологического опроса, проведенного рабочей группой общественного объединения «Экодом», показал, что 95 % жителей крупных городов нашей страны хотели бы ее покупать, при этом более 71 % опрошенных готовы платить за нее на 20 % дороже, чем за обычные продукты питания.

## ЧТО ПРЕДПОЛАГАЕТ ПРИНЯТЫЙ ЗАКОН?

Теперь в соответствии с законом «О производстве и обращении органической продукции» на прошедшие сертификацию продукты питания будет наноситься знак «Органический продукт». Порядок его нанесения будет определяться Государственным комитетом по стандартизации Республики Беларусь. Знак «Органический продукт» на территории Беларуси будет использоваться только при соблюдении требований соответствующих статей принятого закона.

Производство органической продукции предполагает отказ от использования синтетических минеральных удобрений, химически синтезированных пестицидов, синтетических гормонов и регуляторов роста. Допускается использование препаратов, изготовленных из растений и биодинамических препаратов. Удобрение и восстановление плодородия почвы осуществляется путем использования органических удобрений, севооборота, зеленых удобрений.

Законом определено, что финансирование производства и обращения органической продукции может осуществляться за счет средств производителей органической продукции, а также за счет средств республиканского и местных бюджетов в рамках выполнения государственных программ, в том числе содержащих подпрограммы в области производства и обращения органической продукции и других источников, не запрещенных законодательством.

Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь в настоящий момент уточняет перечень кормовых добавок минерального происхождения, микроэлементов, технологических кормовых добавок, разрешенных для кормления животных при производстве органической продукции. Также приводится в соответствие перечень разрешенных к применению при производстве органической продукции веществ растительного или животного происхождения, обладающих фармакологической или биологической активностью, для ветеринарного обслуживания.

Министерству здравоохранения Республики Беларусь поручено уточнить перечень пищевых добавок, ароматизаторов и технологических вспомогательных средств, допустимых для применения в производстве органической продукции.

Принятие закона «О производстве и обращении органической продукции» позволит не только наладить производство экологически чистых продуктов питания и обеспечить потребности жителей нашей страны, но и сохранить рациональное использование природных ресурсов при производстве и обращении органической продукции.

**Наталья БИТЕЛЬ.**

Тэлесеткі

# ЭКСКЛЮЗІЎ З АГЕНЬЧЫКАМ

Ці ведаеце вы хоць бы ў агульных рысах, як вырабляецца адзін з галоўных сімвалаў маштабных міжнародных спаборніцтваў — факел? Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі дэталёва вывучыла гэта пытанне і гатова падзяліцца з гледачамі эксклюзівам. 31 сакавіка ў інфармацыйна-аналітычнай штотыднёвай праграме «Галоўны эфір» выйдзе спецыяльны сюжэт, прысвечаны факелу II Еўрапейскіх гульняў у Мінску. Аўтары раскажуць пра месца вырабу факела, яго адметныя характарыстыкі, асаблівасці гравіроўкі, лазерную рэзку, афарбоўку і іншыя тэхналагічныя працэсы, а таксама пра тонкасці арганізацыі эстафеты «Полымя міру», напрыклад, што неабходна рабіць яе ўдзельнікам падчас дажджу.

Нагадаем, возьме старт сёлетняя эстафета агню 3 мая ў Рыме, з цэнтра «вечнага горада» факел адправіцца на гару Манблан і далей па краінах Еўропы. У Беларусі факел II Еўрапейскіх гульняў у суправаджэнні 450 ураджэнцаў абласцей пабывае ва ўсіх рэгіёнах, і, нарэшце, 21 чэрвеня запаліць сімвалічны агонь на стадыёне «Дынама», які яшчэ памятае агні Алімпіяды-80.




Фота з сайта Белтэлерадыёкампаніі.

Акрамя таго, будучаму спартыўнаму форуму прысвечана і новая праграма «Гульні.by», якая пачала выходзіць на тэлеканале «Беларусь 1» у сакавіку. Гэты праект — своеасаблівы відэадзённік II Еўрапейскіх гульняў, які не толькі ў лёгкай і захапляльнай форме расказвае пра падрыхтоўку да спаборніцтваў, але падтрымлівае актыўную зваротную сувязь з гледачамі. Так, ужо ў першых выпусках вядомыя беларускія спартсмены разыгралі некалькі запрашальнікаў на цырымонію адкрыцця форуму, а вядучыя Іна Пілевіч, Андрэй Казлоў, Станіслаў Ліпскі і Крысціна Козел у прамым і пераносным сэнсе «прымерылі» на сябе розныя спартыўныя дысцыпліны. Інтэрактыў і сюрпрызы для гледачоў стваральнікі «Гульняў.by» абяцаюць выдаваць бесперабойна на працягу ўсяго праекта.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 85

Адбылося першынство Беларусі па шашках-64 сярод хлопчыкаў і дзяўчатак 2011 г. н. і маладзейшых, у якім прыняло ўдзел каля 70 юных шашыстаў. У турніры дзяўчатак перамаглі Нэлі Куртова, Юлія Ліс, Васіліна Кулагіна, у хлопчыкаў мацнейшымі сталі Аляксей Паўлючэнка, Мікіта Лагуткоў, Фелікс Баярскі.

Майстар спорту міжнароднага класа Дзмітрый Фадзееў стаў пераможцам чэмпіянату Мінска па рускіх шашках сярод мужчын з парушэннем зроку. У такім жа турніры, але ўжо па міжнародных шашках, перамог майстар спорту Уладзімір Беляеўскі. У турніры жанчын па абодвух відах шашак перамагла Ірына Чараднічэнка.

На дыяграме № 25 варыянтная дамачная праблема, складзеная майстрам шашачнай кампазіцыі Генадзем Андрэевым (Латвія). Белыя пачынаюць і выйграюць.

**№ 25**



**Белыя простыя шашкі:** b4, d2, f4, h2, белыя дамкі d8 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** a5, b2, d6, e5, g3, g7, h4 (7)

Яшчэ некалькі дамачных кампазіцый, складзеных вядучым аддзела. Белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**№ 26**

**Белыя простыя шашкі:** b6, c5, c7, f4, h4 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** d2, e3, f2, f6, g7, чорныя дамкі a5 (6)

**№ 27**

**Белыя простыя шашкі:** b4, c5, d4, e5, f4, белыя дамкі c1 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, c7, f8, f2, g7, h6 (6)

**№ 28**

**Белыя простыя шашкі:** b4, c5, d4, e5, f4, белыя дамкі c1(6)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, b2, c7, f8, g7, h6, h8 (6)

20—21 красавіка 2019 года ў сталічнай СДЮШАР па шахматах і шашках (вул. Ракаўская, 24) пройдзе адкрыты рэспубліканскі турнір па шашках-64 памяці вядомага майстра Марата Гелера. Даведкі па тэл. (8 029 5621190 )

Праверце свае рашэнні: выпуск № 84 ад 15.03.2019.

№ 19. e5, a3 (g7) g3 (f6) f4 (e5, e7, f6) d6 (b4) c7 (e5) d8 (d4) h4 (e3, c3 =)

№ 20. e3, b6, e7 (f6) e7, g5 (b2, c5) f6, b4 (e3) e1 (b6) ab4X.+

№ 21. c3, c3, c7, b2, b4, h6, f6X.

№ 22. ef4, d6, e7, cd2, e3, c7 (b6, e7) b6 (d6) a7 (e5) b8 (d4) f4 (c3) c1X.

№ 23. 28, 7, 449, 1, 35(13)8, 43+

№ 24. 22, 3(44)40, 21(40A)17(45)50+

Правільныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага р-на), Ф. Карпей (Мядзел), У. Статкевіч (п. Зялёны Бор, Івацэвіцкі р-н), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі р-н), В. Бандарык (Мінскі р-н).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск; e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# СМЯЯЦЦА — ПРАПАНУЕЦЦА!

## 5 выдатных савецкіх кінакамедый

**Складаючы рэйтынгі кіно, кожнае профільнае выданне або рэсурс выбірае свае крытэрыі: ХХ стагоддзе альбо толькі апошнія 10 гадоў, ацаніць касавыя зборы альбо колькасць атрыманых кінапрэмій... Напярэдадні Дня смеху «Звязда» прапануе чарговую і, безумоўна, суб'ектыўную падборку найлепшых савецкіх камедый, якія многія з нас помняць, пяшчотна любяць і з задавальненнем пераглядаюць.**

### «ВЯСЕЛЛЕ Ў МАЛІНАЎЦЫ»

Украіна, 20-я гады мінулага стагоддзя. Вяселле Андрэйкі і Ярыны пад пагрозай зрыву, бо да дзяўчыны заляцаецца мясцовы атаман, а папросту галава бандыцкай хеўры Грыцыян Таўрычаскі. Але тут у справу ўмешваюцца чырвонаармейцы, былы артылерыст і кемлівасць мясцовых вяскоўцаў — і нашы, як вядзецца, перамагаюць.



**Адтуль:** «І што гэта я ў цябе такі закаханы?»

Самая смешная сцэна: танец «у ту стэп».

### «БРЫЛЬЯНТАВАЯ РУКА»

Фільму пра ўзорнага сем'яніна Сямён Сямёныча Гарбункова, які адправіўся ў замежную паездку і міжволі аказаўся ўцягнуты ў аперацыю супраць кантрабандыстаў, споўнілася 50 гадоў, а папулярнасці ён па-ранейшаму не страчвае. У далёкім жа 1969-м яго паглядзелі ў кінатэатрах 76,7 мільёна гледачоў, што дазволіла фільму стаць адной з самых касавых камедый у СССР!

**Адтуль:** «Не ведаю, як там у Лондане, я не была... А ў нас домакіраўнік — сябар чалавека!»

Самая смешная сцэна: пасядзелкі ў рэстаране.

### «ІВАН ВАСІЛЕВІЧ МЯНЯЕ ПРАФЕСІЮ»

Хтосьці марыць хоць ненадоўга стаць царом, а хтосьці не ведае, што рабіць з такім шчасцем. Напрыклад, пенсіянер-актывіст Іван Васілевіч Бунша, які ў выніку фантастычнага эксперымента суседа-вынаходніка выпадкова памяняўся месцамі і ролямі не з кім-небудзь, а з самім Іаанам Грозным.



Дадайце сюды аферыста Міласлаўскага, рэжысёра Якіна, мітусню ў часе і прасторы — камедыя-хіт 1973 года гатовая! А ці многія з вас ведаюць, што фільм зняты паводле п'есы Міхаіла Булгакава, з-за чаго многія эпізоды ў ім цэнзура патрабавала выразаць або перарабіць?

**Адтуль:** «Ікра чорная, ікра чырвоная, ікра заморская — баклажанная».

Самая смешная сцэна: размова цара і Якіна.

### «АПЕРАЦЫЯ «Ы» І ІНШЫЯ ПРЫГОДЫ ШУРЫКА»

Студэнт Шурык з зайздроснай рэгулярнасцю трапляе ў прыгоды — то рамантычныя, здаючы экзамен з дапамогай сімпатычнай сакурсніцы Любы, то забаўныя, «перавыхоўваючы» на будаўнічай пляцоўцы дармаеда Федзю, а то і небяспечныя, падмяняючы на начным дзяжурстве сваю кватэраўласніцу, бабульку — «божы дзьмухавец». Гісторыі пра Шурыка і неразлучнае трыа з Труса, Балбеса і Бывалага толькі ў год прэм'еры фільма ўбачылі больш за 69,5 мільёна гледачоў, а ў найбуйнейшай у свеце інтэрнэт-базе кінафільмаў IMDb стужка мае рэйтынг 8,6 з 10.

**Адтуль:** «Трэба, Федзя, трэба!»

Самая смешная сцэна: пагоня на будаўнічай пляцоўцы.

### «ДЖЭНТЛЬМЕНЫ ЎДАЧЫ»

Пошукі скрадзенага шлема Аляксандра Македонскага маглі б стаць захапляльным дэтэктывам. Але ў рэжысёра Аляксандра Серага сталі камедыяй, у якой дырэктар дзіцячага садка Трошкін літаральна ўлазіць у шкуру рэцыдывіста Дацэнта і, трапіўшы ў злачынную шайку, незаўважна «перавыхоўвае» яе ўдзельнікаў. Фільм адметны яшчэ і тым, што прыдуманая яго аўтарамі «блатная мова», далёкая ад сапраўднага крымінальнага свету, насамрэч пайшла ў народ і змяніла лексікон многіх людзей.

**Адтуль:** «Кіна не будзе, электрычнасць скончылася!»

Самая смешная сцэна: уцёкі з турмы.




### ЛІХВЯРЫ СПАГАДЫ НЕ МАЮЦЬ

**Свой, адметны чытач у газеты «Звязда». Ён жа, хочацца верыць, глядач тэлеканала «Беларусь 3» і ў прыватнасці праграмы «Размаўляем па-беларуску». Гэтая тэлевіктарына ўжо каторы год у эфіры і магла б выходзіць далей — у звычным фармаце. Аднак стваральнікі вырашылі ўдасканаліць яго (над чым і працуюць)...**

А пакуль усе, хто цікавіцца мовай, шануюць яе і, магчыма, плануюць удзел у віктарыне, могуць праверыць сваё веданне з дапамогай «Звязды». Такім чынам

ЦІ ВЕДАЛІ ВЫ, ШТО:

**дыхто́ўны** — вельмі добры, высокай якасці;

**зача́ўраць** — зачахнуць, змарнець;

**ку́чма** — 1) шапка футрам наверх, 2) пра пышныя, густыя валасы;

**ліхвя́р** — той, хто бярэ вельмі высокія працэнты за пазычаныя грошы;

**пярэ́рва** — 1) прастора, якая раздзяляе якія-небудзь масівы; 2) часовы перапынак;

**рэ́згіны** — прыстасаванне насіць сена, салому, зробленае з вяровачнай сеткі, нацягнутай на сагнутыя пруткі;

**скуго́ліць** — 1) жаласна выць, падвываць; 2) наракаць, скардзіцца, прасіць чаго-небудзь;

**спага́да** — 1) спачуванне каму-небудзь, добразычлівыя адносіны да каго-небудзь; 2) літасць да каго-небудзь;

**колькі змогі** — вельмі хутка (бегчы, кідацца) (*беларускія сінонімы:* што моцы, як сілы, як моцы стае, як маеш (меў) моцы; *рускі адпаведнік:* что есть мочи (бежать);

**хоцькі-няхоцькі** — насуперак жаданню, незалежна ад старання (*беларусы яшчэ скажуць:* рады не рады, а мусіш, хочучы-няхочучы, хочаш не хочаш, а ногі намочыш, гніся не гніся (ды ў аглоблі станавіся); *руския*: хочешь не хочешь).

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.10** «Зона Х» (16+).
**9.10** «Галоўны эфір».
**10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Вярні маё каханне» (16+).**
**12.45, 13.05, 14.35, 15.25 Меладрама «Другое першае каханне». 1—4-я серыі (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** «Нашы» (6+).
**22.10 Серыял «След» (16+).**
**23.50** «Арэна».
**0.45** «Дзень спорту».

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.35** «Тэлебарометр».
**9.05, 20.05 Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).**
**10.10** «Капейка ў капейку» (12+).
**10.50** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**11.25** «Свет навыварат. Непал» (16+).
**12.20** М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (0+).
**13.10** Анімацыйны фільм «Гісторыя цацак-2» (0+).
**14.40 Камедыя «Голы пісталет» (12+).**
**16.10 Трылер «Водмель» (16+).**
**17.40** «Веру — не веру» (16+).
**19.15** «Суперлато».
**21.10, 22.05** «Тата папаў» (16+).
**22.00** КЕНО.
**23.00** «Хадзі сюды і танцуй».
**23.05 Серыял «Жаночы доктар» (16+).**
**0.00** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40, 12.20** «Беларуская кухня». Грыбны квас.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.15, 20.30** «Гэты дзень».
**8.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.25, 16.50 «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм. «У палоне ў канібалаў» (12+).**
**10.35** «Навуканамія» (6+).
**11.05** «Архітэктура Беларусі».
**11.20, 21.05** «Апошні дзень». Яўген Еўтушэнка (12+).
**12.50** «Беларусь як песня». Ансамбль «Песняры».
**13.20** «Наперад у мінулае».
**13.50, 19.25** «Вызваленне». «Усходне-Пруская аперацыя. Разведка» (12+).
**14.20, 21.45 «Ад'ютант яго правасхадзіцельства». Маст. фільм. 1-я серыя (12+).**
**15.35** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**16.05** «Доказы з мінулага». Тайна скарбаў Фабержэ (16+).
**18.00** «Легенды беларускай эстрады». Тамара Раеўская.
**18.30** Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску — 2006».
**19.50** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Мастак-рэстаўратар Аркадзь Шпунт.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.55** «Артэфакты». Каменная свідраваная сякера.
**23.25** «Легенды музыкі». Мікаэл Тарывярдзіеў (12+).

## Беларусь 5

**7.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Тотэнхэм».
**8.50** Вынікі тыдня.
**9.30** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 1-ы тур. «Дынама» (Мінск) — «Славія» (Мазыр).
**11.20** Вялікі спорт.
**12.05** Змешаныя адзінаборствы. Міжнародны турнір.
**14.10** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 1-ы тур. «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — «Дынама» (Брэст).
**16.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**17.00** Тэніс. WTA. Чарльстан.
**19.20** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. 1/2 фіналу. Сёмы матч. «Нёман» (Гродна) — «Шахцёр» (Салігорск). (У перапынках — Спорт-цэнтр.) Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. Фінал. Трэці матч. СКА (Санкт-Пецярбург) — ЦСКА (Масква). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Ньюкасл». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.50** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** (з субцітрамі), **8.00** (з субцітрамі), **9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.10 Серыял «Доўгі шлях дадому» (16+).**
**12.05** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Каралева гульні» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.25, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10** Ток-шоу «Наша жыццё».
**22.10 Серыял «Падкідыш» (16+).**
**0.10 Серыял «Краіна 03» (16+).**
**1.10** «Нашы навіны. Галоўнае за дзень».

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.05** «Вадзіць па-руску» (16+).
**9.25** «Тыдзень».
**10.40, 23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**12.40, 23.45** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 0.20** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**14.40** «Вадзіць па-руску» (16+).
**15.10, 16.50 «Метад Фрэйда». Серыял (16+).**
**19.55, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30 «Водблiскі». Серыял (16+).**
**22.10** «Глядзець усім!» (16+)
**1.10** «Мінтранс» (16+).
**1.50** «Самая карысная праграма» (16+).

## МІР

**6.00, 10.10, 5.45 Серыял «Жукаў» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**12.30, 0.10** «Такому мама не навучыць» (12+).
**13.15, 2.20** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10, 0.40** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 1.30** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 19.20 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.55** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.40 Серыял «Мар'ін гай» (16+).**
**5.20** «Культ/Турызм» (16+).

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.45** «Плюс мінус». Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35, 14.30 Серыял «Жанчыны на мяжы» (16+).**
**13.35** «Наша справа» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.35** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.25** «Лёс чалавека» (12+).
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «На краі» (16+).**
**22.30, 23.10** «Хто супраць?» Ток-шоу.
**0.30** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**6.25** «Гарады Беларусі» (6+).
**7.10** «Раніца. Самае лепшае» (16+).
**8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**9.35** «За гранню» (16+).
**10.20** «Чакай мяне» (12+).
**11.05** «Крутая гісторыя» (12+).
**11.55, 23.05** Пракурорская праверка (16+).
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00, 16.30 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**17.05** «ДНК» (16+).
**18.10** «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).
**19.40** Сёння. Галоўнае.
**19.55 Серыял «Марскія д'яблы. Рубяжы радзімы» (16+).**
**22.40** «НЗ.by».

## 8 канал

**7.00, 15.55, 19.00, 21.05, 0.55** «На двор'е».
**7.05, 16.05** «Мультпарад».
**7.25, 16.00** «Гумарынка».
**7.30 Камедыя «Аферысты» (16+).**
**9.00** Дак. серыял «Радавыя праклёны» (12+).
**9.30, 19.05 Серыял «Кандзіс Рэнуар» (16+).**
**10.30 Прыгоды «Свет юрскага перыяду» (12+).**
**12.40, 20.00 Серыял «Смяротная зброя» (16+).**
**13.30 Баявік «Праўдзівая хлусня» (16+).**
**16.30** Дак. фільм «Дзіўная справа».
**17.15 Серыял «Пуаро Агаты Крысці» (12+).**
**19.50** «Аналітычны прагноз».
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10** «Вячэрні квартал-95».
**22.50 Камедыя «Дзень галасавання» (16+).**



## ВТБ

**6.05, 4.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**6.50, 5.00** «Лаві момант» (16+).
**7.25, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**8.20, 2.40** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**9.15** М/ф «Марын і яго сябры» (0+).
**9.45** М/ф «Тры каты» (0+).
**10.05, 18.40, 22.35** «Уральскія пельмені» (16+).
**10.40** «Наш рамонт» (16+).
**11.30** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.20** «Проста кухня» (16+).
**13.00** «Рогаў. Студыя 24» (16+).
**14.00, 23.40** Скетч-шоу «Нерэальная гісторыя» (12+).
**15.25** Анімацыйны фільм «Рэальная вавёрка» (0+).



**17.00** Анімацыйны фільм «Смурфікі: закінутая вёска» (0+).
**20.10** Фантастыка «5-я хваля» (16+).
**1.05** «Хачу верыць!» (16+)

## Культура

**6.30** «Лета Гасподняе». Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы.
**7.05** «Сіта і Рама». Серыял.
**9.20** «Звычайны канцэрт».
**9.50** «Мы — грамацеі!»
**10.35** «Кур'ер». Маст. фільм (0+).
**12.00** «Навуковы стэндап».
**12.40** «Лісты з правінцыі». Пенза.
**13.10** «Дыялогі пра жывёл. Лора Парк. Тэнэрыфэ».
**13.50, 1.00** Невядомы «Масфільм». «Тугі вузел». Маст. фільм.
**15.45** «Больш, чым каханне». Алег Яфрэмаў і Ала Пакроўская.
**16.30** «Карціна свету».
**17.10** «Пешшу...» ВДНГ.
**17.35** 85 гадоў Льву Анінскаму. «Лінія жыцця».
**18.30** «Рамантыка рамансам». Аляксандр Дамагараў.
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** «Звычайны чалавек». Маст. фільм (12+).
**21.45** «Белая студыя».
**22.25** Другая цырымонія ўручэння Міжнароднай прафесійнай музычнай прэміі «BraVo» ў сферы класічнага мастацтва.
**2.35** «Мартынка». «Кот, які ўмеў спяваць». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00, 7.20, 8.40, 9.45, 11.00, 11.40, 14.40, 18.40, 20.35, 21.45, 23.35, 2.50, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**6.10, 0.05** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1956-ы. 2008 год (12+).
**7.35** Кінаканцэрт «Дэтэктыў... Дэтэктыў... Дэтэктыў!» 1983 год (12+).
**9.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**11.15** Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі» (16+).
**12.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**12.55** «Паэзія. У нас у гасцях паэт Булат Акуджава». 1972 год (12+).
**13.15** Маст. фільм «Сямёра смелых» (12+).
**15.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**16.00** «Вакол смеху». Бенефіс пісьменніка Сямёна Альтава. 1990 год (12+).
**17.15** Канцэрт «Sixties Soft Rock». 2004 год (12+).
**18.00** «Акулы пяра». Гурт «Рондо». 1995 год (18+).
**19.00** «Сустрэча сяброў». Тэатральныя сустрэчы ў Доме акцёра. 1993 год (12+).
**22.00** Тэлеспектакль «Гульцы». Па аднайменнай камедыі М. Гогаля. 1978 год (12+).
**1.25** Тэлеспектакль Оскар Уайльд «Як важна быць сур'ёзным». 1976 год (12+).
**5.45** «Паэт Генадзь Айгі чытае свае вершы». 2-я частка. 2005 год (16+).

## EuroSport 1

**2.00, 21.00** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**2.30, 18.30** Аўтагонкі. WTCR.
**3.00** Плаванне. Nordic Swim Tour.
**4.00** Снукер. China Open.
**7.55, 21.35** Снукер. China Open. Фінал.
**11.10** Watts.
**11.15, 23.00** Веласпорт. «Тур Фландрыі».

## Кінакамедыя

**0.45** Іронія лёсу. Працяг (12+).
**2.55** «Чорная Маланка» (6+).
**4.50** Выгляд зверху лепшы (12+).
**6.30** Незадаволенае сексуальнае напружанне (18+).
**8.15** Рэальны тата (12+).
**10.05** Дзень радые (16+).
**12.05** Вялікі тата (12+).
**13.50** Усё або нічога (16+).
**16.00** Вельмі дрэнная настаўніца (18+).



**17.45** Выкідала (18+).
**19.30** Шчаслівы выпадак (16+).
**21.15** Наша Russia. Яйкі лёсу (16+).
**22.55** Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу (16+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**9.30** «Заўтра сёння» (12+).
**10.00** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
**10.50** «Глядзі сам» (12+).
**11.10, 1.50** «Маёр паліцыі». Серыял (16+).
**14.50, 4.50** «Ён і яна» (16+).
**16.15** «Талаш». Драма (12+).



**20.30** «Без падману» (16+).
**21.25** «Асцярожна, махляры!» (16+)
**22.00** «Самалёт прэзідэнта». Трылер (12+).
**0.20** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).

## ТБ1000

**6.10, 13.20** Рамэа і Джульета (12+).
**8.40** Абяцанне (16+).
**11.25** Выпадковы муж (16+).
**15.50** Трывожны выклік (16+).
**17.50** Злаві таўстуху, калі зможаш (16+).
**20.10** Ла-Ла Лэнд (16+).
**22.40** Без заганы (12+).
**0.50** Планетарыум (18+).
**3.00** Арбіта 9 (16+).
**4.35** Скнара (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Аднакласніцы (16+).
**8.00** Райскія кучкі (16+).
**10.15** Ура! Канікулы! (6+).
**12.20** Дзесяць негрыцянят. 1-я серыя (12+).
**14.50** Калектар (16+).
**16.20** Урфін Джус і яго драўляныя салдаты (0+).
**18.10** Любоў-маркоў (12+).
**20.20** Аднакласніцы: новы паварот (16+).
**22.00** Вій (12+).
**0.35** Зацьменне (12+).
**2.20** Чатыры таксісты і сабака (6+).
**4.30** Нулявы кіламетр (16+).

## National Geographic

**6.00** Зона будаўніцтва (16+).
**6.25** Неверагодныя машыны (16+).
**7.15, 4.25** Аўта-SOS (16+).
**8.45** Кітай з вышыні птушынага палёту (16+).
**9.30** Востраў бунтароў (16+).
**11.45** Невядомы Кітай (16+).
**12.35, 19.50** Настольная кніга дыктатара (16+).
**15.00** «Фры-сола» (16+).
**16.40, 23.00** Нараджэнне Еўропы (16+).
**19.00, 21.25** Асушыць акіян (16+).
**1.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**2.50** НЛА ў Еўропе (16+).

## Discovery

**8.00, 18.00** Як гэта ўстроена? (12+)
**9.00, 19.00** Як гэта зроблена? (16+)
**10.00** Невядомая экспедыцыя (16+).
**11.00** Залатая ліхаманка (16+).
**12.00, 20.00, 2.55** Разбуральнікі легенд (16+).
**13.00, 4.40** Дылетант супраць эксперта (12+).
**14.00, 23.00** Музейныя тайны (12+).
**15.00, 3.50** Эд Стафард: гульня на вылет (16+).



**16.00** Майстры патаргаваца (12+).
**0.00** Не спрабуйце паўтарыць (16+).
**1.00** Самагоншчыкі (18+).
**2.00** Гіганцкія хабы (12+).
**5.30** Паляўнічыя на старызну (12+).
**7.10** Гаражны рамонт (12+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена.*

## Беларусь 1

6.35 Слова мітрапаліта Паўла на Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы.
**6.45 Меладрама «Тата ў законе». 3-я і 4-я серыі (12+).**
8.20 «Клуб рэдактараў» (16+).
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал» (12+).
**9.45, 12.35 Серыял «Сваты-4» (12+).**
10.45 «На вылет!» (12+)
11.35 «Гульні.by».
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
13.35 «Я ведаю» (6+).
15.15 «Твой горад».
15.30 «Вакол планеты».
16.15 «Усё пуцём!»
**16.40 Меладрама «Жонка напракат». 1—4-я серыі (12+).**
20.40 Навіны надвор'я.
21.00 «Галоўны эфір».
**22.10 Меладрама «Лішні». 1—4-я серыі (12+).**

## Беларусь 2

**6.55 Серыял «Цэнтральная бальніца» (16+).**
8.30, 19.50 «Тэлебарометр».
8.35 М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (0+).
9.25 «Свет навыварат. Непал» (16+).
10.15 «ЖаннаПажані» (16+).
**11.15 Камедыя «Монстр-тракі» (6+).**
**13.00 Драма «Справа храбрых» (16+).**
15.15, 23.55 «Арол і рэшка. Кругасветка» (16+).
16.15 «Тата папаў» (16+).
17.50 «Бітва экстрасэнсаў». 17-ы сезон (16+).
20.25 «Абмен жонкамі» (16+).
22.00 Спартлато 5 з 36, КЕНО.
22.05 «Вярніце мне прыгажосць» (16+).
23.25 «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

## Беларусь 3

7.30 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
8.05, 20.15 Навіны культуры.
8.25, 20.30 «Гэты дзень».
**8.25 «Смешныя людзі!» Камедыя (6+).**
10.00 «Наперад у мінулае».
10.30 «Беларуская кухня». Раўгеня з блінамі на калодзе.
11.00 «Нацыянальны хіт-парад».
**11.55 «Я — Хорціца». Маст. фільм (12+).**
13.00 «Майстры і куміры». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Аляксандр Падабед.
13.55 Святочная праграма да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі. Мюзікл «Дуброўскі».
**16.35 «МУР». Маст. фільм. «1941» (16+).**
19.35 «Арт-гісторыі». «Тайны рэстаўрацыі».
20.00 «Архітэктура Беларусі».
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Трыццаць тры». Камедыя (12+).**
22.20 «Легенды кіно». Яўген Лявонаў (12+).
**22.45 «Асцярожна, бабуля!» Камедыя (12+).**

## Беларусь 5

6.45 Хакей. Таварыскі матч. Беларусь — Расія (Алімп).
8.30 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 2-і тур. «Нёман» (Гродна) — «Шахцёр» (Салігорск).
10.25 Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. Фінал. Пяты матч. «Авангард» (Омская вобл.) — «Салават Юлаеў» (Уфа).
12.20 Піт-стоп.
12.50 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. Трэці матч.
15.10 Мастацкая гімнастыка. Кубак свету. Пезара.
17.50 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 2-і тур. «Дынама» (Брэст) — «Дняпро-МГЗ» (Магілёў). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
19.50 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Батумі. Мужчыны. 61 кг. Фінал.
21.10 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Батумі. Жанчыны. 55 кг. Фінал.
22.35 Вынікі тыдня.
23.20 Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. Фінал. Шосты матч. СКА (Санкт-Пецярбург) — ЦСКА (Масква).

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00 (з субцітрамі) «Нашы навіны».
**7.10 Анімацыйны фільм «Кот Гром і зачараваны дом» (0+).**
8.40 «Метэагід».
9.10 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.25 «Здароўе» (16+).
**10.35 Камедыя «Вяселле ў Малінаўцы» (6+).**
12.30 «Галоўная роля» (12+).
14.00 «Тры акорды» (16+).
16.20 «Ледніковы перыяд. «Дзеці» (0+).
18.35 «Лепш за ўсіх!» (0+)
20.00 «Контуры».
21.05 «Што? Дзе? Калі?» Вясновая серыя гульняў (16+).
**22.20 Серыял «Штрафнік» (16+).**
**0.20 Камедыя «Вялікая маленькая Я» (12+).**

## СТБ

**6.10, 1.10 «Кур'ер». Драма. (12+).**
**7.40, 11.00, 20.35** Дакументальны спецпраект (16+).
9.20 «Мінтранс» (16+).
10.00 «Скардзіцца дазваляецца».
10.30 «Вялікі горад».
**12.10, 13.40, 16.40 «Катоўскі». Серыял (16+).**
13.30, 16.30 Навіны «24 гадзіны».
19.30 «Тыдзень».
23.00 «Тыдзень спорту».
23.30 «1/8 фіналу Міжнароднай лігі КВЗ». Першая гульня (16+).

## МІР

**6.00, 6.30, 7.35, 8.35** М/ф (0+).
6.15 «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
7.05 «Беларусь сёння» (12+).
8.05 «Культ/Турызм» (16+).
8.55 «Яшчэ танцей» (12+).
9.25 «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Сусветныя лэдзі» (12+).
**10.45, 16.15, 19.30 Серыял «Вясковая камедыя» (16+).**
18.30, 0.00 «Разам».
**1.00 Маст. фільм «Дэжа вю» (12+).**
**5.20 Серыял «Ваўчынае сонца» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Альпініст» (12+).**
**08.40 Маст. фільм «Няўдачлівы» (12+).**
10.30 «Смехапанарама» Яўгена Петрасяна» (16+).
11.00 Весткі.
**Арганізацыя самазанятасці насельніцтва — сярод прыярытэтаў мясцовых улад. На землях Гомельшчыны, што пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, гэтая тэма актуальная асабліва. Таму досвед Брагінскага раёна па ўкараненні прынцыпаў экалагічнага земляробства для вытворчасці якаснай прадукцыі ў сялянска-фермерскіх гаспадарках варты ўвагі. Напярэдадні кіраўнікі Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню ў Брагінскім раёне абмеркавалі работу па рэалізацыі мясцовых ініцыятыў ва ўзаемадзеянні з міжнароднымі арганізацыямі.**

### Навучылі вырошчваць чыстую прадукцыю

Яшчэ ў 2017 годзе Брагінскі раённы Савет дэпутатаў і грамадскасць паўдзельнічалі ў тыднях устойлівага развіцця і арганізавалі сустрэчы па сельскіх выканаўчых камітэтах, каб выявіць патрэбы мясцовых жыхароў. Той жа мэце садзейнічаў і конкурс «Мая Брагіншчына праз пяць гадоў». У раёне быў створаны Савет па ўстойліваму развіццю, які ўзначаліў старшыня Брагінскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр Калясан. Ён нагадвае, што раён як быў, так і застаецца пераважна сельскагаспадарчым:

— Нягледзячы на тое, што ўся наша тэрыторыя падверглася радыеактыўнаму забруджванню, раён працягвае жыць і развівацца. Дарэчы, у раёне зарэгістравана 18 сялянска-фермерскіх гаспадарак. Дзякуючы выкарыстанню прынцыпаў арганічнага земляробства, інавацыйных тэхналогій шэраг іх вырабляе экалагічна чыстыя прадукты.

Яшчэ ў 2015 годзе ў Брагінскім раёне быў створаны мясцовы фонд падтрымкі прадпрымальніцтва і сельскага развіцця «Эка-Інавацыя». Фонд падаў заяўку ў праект «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» і атрымаў фінансаванне. Галоўнай мэтай ініцыятывы «Якасная прадукцыя» было навучыць мясцовых жыхароў вырошчваць у вялікай колькасці экалагічна чыстую агародніну і садавіну на брагінскай зямлі. Між тым для гэтага мясцовыя жыхары сталі ўдзельнікамі розных вучэбных трэнінгаў. Работнікі адной з фермерскіх гаспадарак пабывалі ў Францыі. Там набывалі вопыт і вывучалі новыя тэхналогіі. Іх потым укаранялі ў сельскагаспадарчую дзейнасць на тэрыторыі Брагінскага раёна.

У выніку былі створаны пяць дэманстрацыйных пляцовак. За кожнай было замацавана па пяць мясцовых жыхароў, якія дзяліліся вопытам вырошчвання раслін і паказвалі, як працаваць з расадай. Уся гэта работа пабудавана на прынцыпах арганічнага земляробства, без ужывання сродкаў хімізацыі на працягу ўсяго працэсу. Галоўная задача праекта — уцягванне мясцовых жыхароў у вытворчы працэс.

### «Школа фермера»

Першай ідэяй было агульнымі сіламі вырасціць адзін гектар кропу. Тыя людзі, якія займаліся гэтым упершыню, са сваіх участкаў сабралі па 200—300 кілаграмаў зеляніны. Мясцовыя фермеры дапамаглі са збытам — і людзі атрымалі магчымасць зарабіць грошы. Галоўнае, што ўся прадукцыя, якую рэалізавалі, адпавядае нормам, не ўтрымлівае нітратаў. Усяго да зялёнай ініцыятывы далучыліся 22 уладальнікі дапаможных гаспадарак.



Кіраўнік праекта «Узаемадзеянне для росквіту» Тацяна КАТЛАБАЙ *(справа)* перадае расаду клубніц Ніне ЯДЧАНЦЫ з вёскі Краснае. Высадкі прызначаны для шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў, якія развіваюць арганічнае земляробства.

— На падставе назапашанага вопыту фонд «Эка-Інавацыя» падрыхтаваў праграму развіцця малога бізнесу і адкрыў «Школу фермера» з машынна-трактарнай станцыяй і навучальнымі пляцоўкамі, — гаворыць Аляксандр Калясан. — Там фермеры могуць навучыцца новым падыходам у вядзенні гаспадаркі і раслінаводстве на прыкладах найлепшых узораў земляробства і раслінаводства. Пры садзейнічанні «Школы фермера» ўмацоўваецца кааператыўныя і лагістычныя ўзаемаадносіны паміж удзельнікамі вытворчасці і рэалізацыі агародніннай прадукцыі, адкрытая машынна-трактарная станцыя аказвае паслугі насельніцтву ў апрацоўцы ўчасткаў з дапамогай спецтэхнікі.

Цяпер на Брагінскай зямлі вырошчваюць звыш трыццаці відаў рознай агародніны: таматы, перац, баклажаны, шпінат, рукалу, шмат разнавіднасцяў капусты: брокалі, квяцістую, пекінскую. Фермеры рэалізоўваюць сваю прадукцыю на рынкі і ў гандлёвыя сеткі вобласці. Нараканняў да якасці прадукцыі і выпадкаў вяртання не было.

### Найлепшы раён для вядзення бізнесу

Яшчэ адзін прыклад: рэалізацыя праграмы па развіцці сеткі патэнцыялаў сямейных клубаў у Брагінскім раёне. У межах праекта, накіраванага на паляпшэнне сацыяльна-эканамічнай сітуацыі на тэрыторыі, якая пацярпела ад наступстваў Чарнобыля, на Брагіншчыне заснавана дзевяць сямейных клубаў. У іх ліку — «Матулін ручнік», «Батлеечнае мастацтва», «У будучыню — з надзеяй», «Сад мары», «Клуб сельскай гаспадаркі».

Праект «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» стварыў умовы для развіцця малога прадпрымальніцтва са школьнай парты: «Творчая майстэрня» працуе на базе Чамярыскага дзіцячага сада — сярэдняй школы. Дзякуючы ініцыятыве медыкаў «Інавацыі ў здароўе» жыхары раёна могуць на ранніх стадыях выявіць анкалагічныя захворванні і хваробы сістэмы кровазвароту. А мясцовая суполка «Брагінскія прысмакі» прапануе стравы, якімі з даўніх часоў харчаваліся нашыя продкі. У праекце «Малінавая ідэя» завязана больш за 40 сем'яў, якія займаюцца вырошчваннем маліны.

— Дарэчы, для земляробства прызначаны ў тым ліку зямельныя ўчасткі, якія вызвалены ў населеных пунктах у выніку зносу пустуючых і старых дамоў, — адзначае старшыня Брагінскага райсавета. — Выкарыстанне такіх участкаў мае шэраг сваіх пераваг, у тым ліку размяшчэнне ў крокавай даступнасці на тэрыторыі непасрэдна населенага пункта. Аператыўная і сістэмная работа па ўсіх пытаннях, звязаных з прадпрымальніцкай дзейнасцю і самазанятасцю грамадзян, — гэта рэзервы, якія дазваляюць вырашаць шэраг важных задач — ад эканамічных да сацыяльных.

Нездарма ж Брагінскі раён летась быў адзначаны дыпломам у намінацыі «Найлепшы горад (раён) Гомельскай вобласці для бізнесу Беларусі — 2018» (з колькасцю насельніцтва менш за 50 тысяч чалавек).

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# САМ САБЕ ГАСПАДАР

## Віцяблянін з'ехаў з горада ў вёску, дзе стаў фермерам і дэпутатам

**Вось ужо восем гадоў віцяблянін Сяргей СУСЛАЎ жыве разам з сям'ёй у вёсцы Красны Двор Віцебскага раёна. Займаецца фермерскай гаспадаркай і ні разу не пашкадаваў, што абраў сельскае жыццё, паведамляюць «Віцебскія весці».**

Ва ўсім яго падтрымлівае жонка Вераніка, якая цяпер у дэкрэтным адпачынку. Клопаты па гаспадарцы і клопат пра дзяцей (у сям'і ёсць сын-школьнік і дачка двух гадоў) яна ўзяла на сябе.

Кіламетраў за шэсць ад Рубы з'язджаем на грунтавую дарогу, што вядзе да вёскі, дзе будуе сваё радавое гняздо сям'я Суславых. На паўдарозе да яе ў лесе схавалася маляўнічае возера, якое летам становіцца месцам паломніцтва для адпачывальнікаў.

— Сядзібай свой дом назваць пакуль не магу, яшчэ вельмі ён сціплы, — кажа Сяргей Аляксандравіч. — І хоць у хаце ўжо ёсць усе выгоды цывілізацыі (водаправод, каналізацыя, цеплазабеспячэнне), аздабленне фасада яшчэ наперадзе.

Не адразу Сяргей рашыўся на такі адказны крок, як пераезд у вёску. Віцяблянін вырас, як той казаў, на асфальце і, здавалася, не быў прыстасаваны да сельскай працы. Праз год-другі мара стаць фермерам магла лопнуць...

— Мне дзявацца не было куды ў прамым і пераносным сэнсе, — дзеліцца Сяргей. — Адносіны з былой грамадзянскай жонкай сышлі да нуля. А калі яна пачула, што я стаміўся бадзяцца па здымных кватэрах і хачу перабрацца на сталае месца жыхарства ў вёску, адказала як адрэзала: «Нам не па дарозе».

Я шукаў домік у вёсцы — недалёка ад горада і не вельмі дорага. Мне ўсё спадабалася ў Красным Двары, калі ўпершыню апынуўся тут: і што дом на ўскрайку, і што побач поле, лес. Разлог, чыстае паветра і цішыня, якую парушаюць толькі салаўіныя спевы ды чырыканне вераб'ёў.

Цалкам падтрымала Сяргея яго цяперашняя жонка Вераніка. Яшчэ некалькі гадоў Суслаў напрацоўваў пачатковы капітал, гандлюючы агароднінай на Паўднёвым рынку. Менавіта тут яму падкінулі ідэю заняцца вырошчваннем бульбы.

Па вялікім рахунку патрэбныя два месяцы напружанай працы вясной, каб пасадзіць яе, і два — увосень, каб сабраць ураджай. Астатні час можна выкарыстоўваць на ўладкаванне побыту, сядзібы, свой адпачынак.

— Цяпер у нас 24 гектары зямлі, палову з якіх яшчэ не ўключыў у севазварот. Не так проста разараць зарослую хмызняком зямлю, — кажа суразмоўнік. — Першыя тры гады, якія даюцца фермерам на раскрутку без выплаты падаткаў, сышлі на выкараненне кустоў. Пачаў з аднаго гектара, цяпер бульбяныя плантацыі займаюць чатыры. Летась сабраў нядрэнны ўраджай бульбы беларускіх гатункаў «Скарб», «Лілея», «Бліскавіца».

Пабудаваў сваё сховішча, ёсць бульбаўборачны камбайн, сартавальная стужка, два трактары з рознымі агрэгатамі. Усё гэта набыў паступова. На гэтую зіму ўпершыню засеяў яшчэ шэсць гектараў азімай пшаніцы.

Сяргей Суслаў у свой час скончыў Віцебскі дзяржаўны тэхнічны каледж па спецыяльнасці «Тэхнік-тэхнолаг». Можа рабіць сваімі рукамі ўсё.

За зіму не толькі адрамантаваў і падрыхтаваў тэхніку да пасяўной, але і пабудаваў саўну з невялікім басейнам. З гэтай нагоды жартуе: «Любая авантура — гэта маё. Чым складанейшую задачу стаўлю перад сабой, тым цікавей яе вырашаць».

Для сваіх патрэб сям'я Суславых трымае 50 трусоў. Але і тут, як заўважыў гаспадар, не ўсё так проста.




Трусіныя скуркі нарыхтоўшчыкі сёння не купляюць. Футравую сыравіну ў літаральным сэнсе даводзіцца закопваць у зямлю ці спальваць. Але ж для фермера гэта страчаная выгада.

Як чалавек, якому да ўсяго ёсць справа, Сяргей прывычаіўся разрульваць не толькі свае праблемы, але і аднавяскоўцаў. Калі трэба нешта падрамантаваць, прасвідраваць, падтачыць, усе ідуць да яго. Не расчышчана дарога — таксама да Суслава, часам нават з прэтэнзіямі: маўляў, чаму падводзіш?

За спагадлівасць, разуменне, гатоўнасць дапамагчы жыхары бліжэйшых вёсак Мазалаўскага сельсавета абралі Сяргея Суслава сваім дэпутатам.

Расказваючы аб грамадскай рабоце, ён не прамінуў агучыць запыт сваіх выбаршчыкаў аб асвятленні вуліцы Садовай. Разам са старшынёй Савета шукае рашэнне гэтага пытання. Не маглі не запытацца ў Сяргея Аляксандравіча, на чым трымаецца яго вера ў поспех, што дае сілы рухацца наперад? «У мяне ніколі не было ўстаноўленых рабочых гадзін і начальнікаў. Я сам сабе гаспадар. Адчуваю адказнасць за сваю сям'ю. Хачу, каб дзеці раслі здаровыя і шчаслівыя, каб жыццё ў вёсцы кіпела. Пакуль ёсць сілы, зраблю ўсё, каб задуманае спраўдзілася», — адказаў ён.

# ГІСТАРЫЧНЫ РЭВАНШ

## Як у адным сельсавеце працуюць 47 фермерскіх гаспадарак

**Вулькаўскі сельсавет Лунінецкага раёна ўнікальны хоць бы таму, што на яго тэрыторыі амаль 50 фермерскіх гаспадарак. Словам, пакуль гэта рэкорд на Брэстчыне на асобна ўзятай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы.**

### Запаветныя сем гектараў

Усё ж цікава, чаму менавіта ў гэтай мясцовасці развіццё фермерства пайшло так актыўна. Можна сказаць, што людзі тут надзвычай працавітыя. І, пэўна, не пакрывіш душой. У дапаможных гаспадарках здаўна вырошчваюць самую розную прадукцыю. Тыя ж клубніцы, якімі праславіўся Дварэц, даўно садзяць у Вульцы-2, Бродніцы, іншых вёсках. Дварэц, куды прыязджаюць скупшчыкі, побач, сюды і вязуць сваю ягаду на продаж мясцовыя гаспадары. Яшчэ адна прычына — землі былога КУП «Міжлескі» заўсёды лічыліся даволі ўрадлівымі, бо кругом многа тарфянікаў, спрэс меліяраваныя ўгоддзі. А недзе пад канец 90-х, калі пачалі хадзіць розныя чуткі наконт будучага калгасаў, людзі запатрабавалі раздзяліць калгасную зямлю на паі. Падлічылі плошчу калгасных палеткаў, падзялілі на колькасць работнікаў, атрымалася па 7,4 гектара на члена калектыўнай гаспадаркі. І многія тады вырашылі рызыкнуць, выйсці з калгаса, каб працаваць самастойна. Так і зрабілі, пачыналі вось з гэтых сямі гектараў. У каго справы пайшлі лепш, хто сумеў вытрымаць рыначныя выпрабаванні, паціху стаў разрастацца. Праўда, ёсць і такія, каму пазней ладны кавалак выдзялялі рашэннем выканкама. Калі мясцовая ўлада ўбачыла эфектыўнае гаспадаранне, фермераў сталі падтрымліваць надзеламі. І цяпер ўжо зямлі ўсім ахвотным не хапае. Але вулькаўскія гаспадары не губляюцца, яны асвойваюць тэрыторыі суседніх раёнаў.

### Рыгор і сыны

Кіраўнік фермерскай гаспадаркі «Рыгор і сыны» **Рыгор БОГДАН** — фермер са стажам. Яго гаспадарцы больш за 15 гадоў. Рыгор Аляксеевіч называе сваю ФГ маленькай, бо зараз, паводле яго слоў, на ўліку ўсяго 180 гектараў. Богданы займаюцца бульбай, агароднінай, ёсць і збожжавыя культуры, найбольш для севазвароту. Гаспадарка зарэгістраваная ў Бродніцы, яе вытворчая база знаходзіцца ва ўрочышчы Грэчын. Туды і накіроўваемся.

Рыгор Аляксеевіч запрашае ў невялікі офіс. Гэта пакой на чатыры рабочыя месцы, дзе пры неабходнасці працуюць кіраўнік і спецыялісты. У агароднінасховішчы, у майстэрні, гаражы штодзень працуюць людзі, пра іх паклапаціліся, у бытоўцы ёсць усё неабходнае. Усяго ў штаце фермерскай гаспадаркі занятыя пастаянна 15—16 чалавек. Пад патрэбу, найбольш на час уборкі ўраджаю, наймаюцца сезонныя работнікі.

Сучаснаму вытворцы бульбы і агародніны вельмі важна мець сховішча для прадукцыі, гэта ў разы памяншае страты. Агароднінасховішча гаспадаркі «Рыгор і сыны» ўяўляе сабой сучасны ангар, узведзены і аснашчаны па ўсіх патрабаваннях тэхналогіі. Тут ёсць лініі па сарціроўцы агародніны. Жанчыны якраз сарціравалі бульбу на канвееры, побач машына накладвала клубні ў мяхі, рабочыя грузілі іх на паддоны і адвозілі ўбок. «Партыя рыхтуецца да адгрузкі ў Расію», — растлумачыў Рыгор Богдан.



Рыгор БОГДАН і старшыня сельскага Савета Аляксандр КУШНЯРЭВІЧ.

### Ад мікра да макра

Зараз пачалася сяўба і фермераў цяжка застаць дома альбо ў офісах. Рыгор Богдан заехаў, каб прасачыць за адгрузкай партыі бульбы і папрацаваць з дакументамі. А **Васіля МАКЕЙЧЫКА** мы засталі па дарозе ў поле. Васіль Іванавіч за рулём трактара МТЗ-82 накіроўваўся на пасяўную дзялянку. Ён, паводле яго ўласнага азначэння, дробны фермер. У яго значацца 37 гектараў ворыўнай зямлі, шэсць адзінак тэхнікі. «Амкадор», напрыклад, браў у лізінг не так даўно. Сваім трактарам «Беларус» гаспадар задаволены. Кажа, што варта добра даглядаць тэхніку, тады і яна служыць доўга. Відаць, дае знаць той факт, што Васіль Іванавіч сам інжынер па адукацыі, таму тэхніка ў яго заўсёды ў парадку. Дарэчы, ён працаваў раней інжынерам у калгасе, а ў 2005 годзе прыняў рашэнне працаваць самастойна.

І ні разу не пашкадаваў аб тым. Зараз гаспадару дапамагаюць жонка, дачка, зяць. Макейчыкі займаюцца, як і ўсе іх суседзі-фермеры, вырошчваннем агародніны. Стацыянарнага сховішча не маюць, а моркву захоўваюць дзедаўскім спосабам — у буртах.

У Вулькаўскім сельсавеце ёсць самыя розныя фермеры. Некаторыя так і засталіся працаваць на сваіх адведзеных некалі сямі гектарах, працуюць толькі сем'ямі, чужых не наймаюць і не скардзяцца.

На тэрыторыі сельсавета на 1200 гектарах зямлі працуе вядомая фермерская гаспадарка «Навіцкіх», высокатэхналагічная сучасная сельскагаспадарчая кампанія, утвораная ў 2001 годзе. У сезон гэта гаспадарка адгружае ў Расію да 20 фур, гэта значыць да 400 тон агародніны, мае свой завод па захоўванні і перапрацоўцы агародніны. Летась у якасці эксперымента фермеру аддалі сельгаспрадпрыемства «Міжлескі» з яго васьмю тысячамі гектараў зямлі, вытворчай базай, калектывам і вялікімі даўгамі. Цяпер там разам з вытворчым працэсам ідзе аптымізацыя, вырашаюцца арганізацыйныя пытанні. Бліжэй да канца года, відаць, можна будзе гаварыць пра нейкія прамежкавыя вынікі эксперымента.

### Сацыяльная адказнасць бізнесу

Сёння варта гаварыць яшчэ пра тое, што вясковыя гаспадары не застаюцца ўбаку ад грамадскага жыцця вёскі, яе добраўпарадкавання. Сельвыканкам з яго сціплым бюджэтам, як правіла, не можа паспяхова вырашаць гэтыя задачы.

Многія з вулькаўскіх фермераў дапамагаюць сваім вёскам у грамадскім жыцці, развіцці інфраструктуры і падтрыманні парадку. **Старшыня Вулькаўскага сельскага Савета Аляксандр КУШНЯРЭВІЧ** у ліку самых надзейных партнёраў мясцовай улады назваў Рыгора Богдана. Той грунтоўна дапамог, калі наводзілі парадак на могілках, трэба было і пясок завезці, і смецце вывезці. Калі пілавалі аварыйныя дрэвы, гэты фермер аплаціў паслугі альпіністаў. І на свята вёскі Бродніца выступіў спонсарам. Ды шмат чаго для сваіх землякоў зрабіў Рыгор Богдан. Калі патрэбны пагрузчык альбо самазвал, мясцовая ўлада звяртаецца да фермера Віктара Даніловіча. Не застаюцца ў баку ад грамадскіх клопатаў Андрэй Яраховіч, Леанід Ермаковіч, іншыя гаспадары.

### Занятасць вяскоўцаў

Вяскоўцам-землякам тутэйшыя фермеры забяспечваюць магчымасць зарабіць. Многія жыхары наймаюцца на сезонныя работы. Іншыя, напрыклад бадзёрыя пенсіянеры, часта ходзяць на падпрацоўку да фермераў. Старшыня сельвыканкама Аляксандр Кушнярэвіч расказвае:

— У сезон кожную раніцу ва ўстаноўленых месцах збіраюцца патэнцыйныя работнікі. Фермерскія аўтобусы пад'язджаюць і бяруць патрэбную на дзень колькасць рабочых. Калі плацяць днёўку, то вясковец атрымлівае звычайна 25—30 рублёў у дзень. А на ўборцы морквы аплата здзельная. Звычайна даюць рубель за мех. Асобныя нашы пенсіянеркі ўмудраюцца за дзень зарабіць 50—60 рублёў. Таму мы не раз заўважаем у пунктах збору людзей з Жыткавіцкага, Салігорскага, Пінскага, іншых раёнаў. З усёй ваколіцы збіраюцца тыя, хто хоча зарабіць.

Тым часам падрастае новае пакаленне фермераў. Дзеці нашых першапраходцаў аддзяляюцца, арганізоўваюць уласныя гаспадаркі. Выхоўваецца чалавек, які любіць і хоча працаваць на зямлі. Можа такім чынам гісторыя ажыццяўляе рэванш за тое, што некалі вяскоўца актыўна адвучвалі ад зямлі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

*Лунінецкі раён.*


**Информация об акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 01.01.2019**

| | |
|---|---|
| Организация | ОАО «БЕЛВТОРЧЕРМЕТ» |
| Учетный номер плательщика | 100071565 |
| Вид экономической деятельности | Переработка отходов и лома черных металлов |
| Организационно-правовая форма | Открытое акционерное общество |
| Орган управления | ОАО «БМЗ — управляющая компания холдинга «БМК» |
| Единица измерения | |
| Адрес | Минский район, аг. Гатово, АБК с проходной, к. 83 |

| 4. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %): | | 0 |
|---|---|---|

| Вид собственности | Количество акций, шт. | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| республиканская | 0 | 0 |
| коммунальная всего: | 0 | 0 |
| в том числе: | х | х |
| областная | 0 | 0 |
| районная | 0 | 0 |
| городская | 0 | 0 |

**5-6. Информация о дивидендах и акциях:**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 1 | 1 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 1 | 1 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 0 | 0 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 0 | 0 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 0 | 0 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 912,65 | 0,00 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 803,13 | 0,00 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 1,837800 | 0,000000 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___ | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___ | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 1,837800 | 0,000000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___ | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___ | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | 2017 год | Х |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 22.03.2018 | Х |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | до 01.07.2018 | Х |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 330,49 | 248,79 |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, — всего | штук | 0 | 0 |

| Акции, поступившие в распоряжение общества | | | Акции, приобретенные в целях сокращения общего количества | |
|---|---|---|---|---|
| Дата зачисления акций на счет «депо» общества | Количество акций, шт. | Срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества | Дата зачисления акций на счет «депо» общества | Количество акций, шт. |
| | 0 | | | 0 |
| **Всего** | **0** | | | **0** |

**7. Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 131133,00 | 89917,00 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 111974,00 | 81065,00 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения — всего (прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | 13513,00 | 5948,00 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 19159,00 | 8852,00 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | -5557,00 | -2848,00 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | -89,00 | -56,00 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 3163,00 | 1374,00 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | 10350,00 | 4574,00 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 33834,00 | 25375,00 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | 2232,00 | 2005,00 |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | 923,00 | 2008,00 |
| **8. Среднесписочная численность работающих** | человек | 696 | 704 |

**9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета):**
Переработка лома и отходов черных металлов (38321)

**10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год:**
28 марта 2019 г.

**Дата подготовки аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности:**
7 марта 2019 г.

**Наименование аудиторской организации (фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется) индивидуального предпринимателя), местонахождение (место жительства), дата государственной регистрации, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей:**
ООО «ФБК Бел», г. Минск, Логойский тракт, 22А, пом. 201. Рег. № 690398039 от 06.02.2009.

**Период, за который проводился аудит:**
01.01.2018 — 31.12.2018.

**Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской (финансовой) отчетности — сведения о данных нарушениях:**
годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Белвторчермет» по состоянию на 31.12.2018.

**Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме:**
29.03.2019 — ЕПФР.

**13. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета):**
Приняты к сведению.

**14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет:**
http://www.bvm.by

ОРША: ПЕРАЗАГРУЗКА

# Гучаць цудоўна!

## Матэрыяльную базу школы мастацтваў і ўстаноў культуры рэгіёна папоўнілі 15 фартэпіяна

**Знакавая падзея ў культурным жыцці Аршанскага рэгіёна. Пятнаццаць новых фартэпіяна папоўнілі матэрыяльную базу школы мастацтваў і ўстаноў культуры рэгіёна. Усяго Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь плануе накіраваць у Віцебскую вобласць 39 інструментаў знакамітага брэнда «Беларусь», паведамляе «Аршанская газета».**



orshanka.by

Гукі сямі новенькіх піяніна цяпер раздаюцца па ўсю моц у дзіцячай школе мастацтваў № 1. Радасць ад гістарычнага моманту перадачы дакументаў ад інструментаў з педагагічным калектывам і яго выхаванцамі прыехаў раздзяліць **міністр культуры Юрый БОНДАР.** Ён пагутарыў з юнымі талентамі і педагогамі, а тыя, у сваю чаргу, падрыхтавалі для высокага госця музычныя падарункі, прадэманстравалі крышталёва чыстае гучанне новага фартэпіяна.

Юная піяністка Сафія Шынкевіч чацвёрты год займаецца па класе фартэпіяна і за гэты час змагла дасягнуць выдатных поспехаў. Яна лаўрэат рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, стыпендыят абласной прэміі па падтрымцы таленавітай моладзі. У яе скарбонцы каля 30 дыпломаў рознага ўзроўню. З музыкай Сафія плануе звязаць будучыню.

— На новым інструменце ўдвая прыемна працаваць, — з веданнем справы кажа юная піяністка. — Гучыць цудоўна!

Ацаніла новае фартэпіяна «Беларусь» і педагог дзяўчыны Галіна Фядосенка:

— Годная якасць інструмента, — кажа яна. — Гучанне чыстае і басы прыгожыя, выразныя. Мы і марыць не маглі аб такім падарунку. Дзякуй велізарны за клопат аб нас.

Юрый Бондар павіншаваў калектыў установы і юных музыкаў з прыемнай падзеяй і ўручыў пашпарты на інструменты дырэктару школы Уладзіміру Грушэцкаму. Міністр падкрэсліў, што сёлета ва ўстановы культуры і адукацыі плануюць паставіць 647 піяніна і больш за 800 — у наступным годзе.

Ён таксама расказаў, што ў краіне дзейнічае больш за 400 школ мастацтваў, у іх займаецца 116 тысяч дзяцей. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы Мінкультуры арганізавала дэталёвую рэвізію ўсяго фонду музычных інструментаў. Замене падлягаюць 1460 фартэпіяна. У рамках падпраграмы «Музычныя інструменты» дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» за два гады ўсе яны будуць заменены на новыя. А таксама адрамантуюць 2300 музычных інструментаў. Апошняя цэнтралізаваная пастаўка музычных інструментаў была больш за 30 гадоў таму, з гэтай нагоды 2019-ы для развіцця музычнай культуры Беларусі можна лічыць знакавым.

# «Савушкін-Орша»: што будзе пасля мадэрнізацыі

**2 кастрычніка 2018 года на тэрыторыі Аршанскага раёна ААТ «Савушкін прадукт» стварыла ТАА «Савушкін-Орша». 19 снежня ў яго склад увайшло вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Аршанскі гарлачык» (раней ААТ «Аршанскі малочны камбінат»), які знаходзіўся ў той час у цяжкім фінансавым становішчы. Гэта далучэнне стала пачаткам адраджэння мясцовай малочкі і новым вітком у развіцці рэгіёна.**

Як паведамляе «Аршанская газета» са студзеня бягучага года ТАА «Савушкін-Орша» спынена на глабальную мадэрнізацыю, каб, улічваючы выгаднае геаграфічнае размяшчэнне, выпускаць малочную прадукцыю як для беларускага і расійскага рынкаў, так і для краін блізкага і далёкага замежжа. А вырабляць якасную канкурэнтаздольную прадукцыю на састарэлым абсталяванні і старых вытворчых плошчах было абсалютна немагчыма.

Агульная сума інвестыцыйнага праекта перавысіць 20 мільёнаў еўра.

Рэканструкцыя праводзіцца паэтапна. Гэта значна павысіць эфектыўнасць работ і дазволіць максімальна хутка распачаць выпуск новай прадукцыі. Агульная сума інвестыцыйнага праекта перавысіць 20 мільёнаў еўра. Цяпер на малочным камбінаце ў Оршы актыўна ідуць работы па стварэнні вытворчай пляцоўкі з магутнасцю перапрацоўкі да 350 тон малака ў суткі (пасля завяршэння другога этапа мадэрнізацыі будзе перапрацоўвацца звыш 500 тон малака ў суткі).

Узводзяцца сучасныя вытворчыя цэхі і лабараторыі, новы цэх прыёмкі малака і мыйнае аддзяленне. Словам, у хуткім часе з'явіцца новы сучасны завод.

На другім этапе рэканструкцыі, пасля запуску новых участкаў, плануюць пашырэнне існуючага вытворчага корпуса, мадэрнізацыя заквасачнага аддзялення, дзеючага апаратнага ўчастка і склада гатовай прадукцыі. І зусім хутка аршанская пляцоўка стане ўзорна-паказальным заводам па выпуску малочнай прадукцыі.

— Далучэнне Аршанскага малочнага камбіната да групы кампаній «Савушкін прадукт» — добры прыклад кансалідацыі, якая адкрывае новыя гарызонты і магчымасці і для кампаніі, і для рэгіёна, і для калектыву, — расказвае **Аляксандр САЎЧЫЦ, генеральны дырэктар ААТ «Савушкін прадукт».** — Але, якім бы сучасным ні было тэхналагічнае абсталяванне, калектыў заўсёды будзе адным з галоўных і каштоўных рэсурсаў нашай кампаніі. Мы шануем сваіх супрацоўнікаў, ствараем для іх камфортныя ўмовы працы і гарантуем годную аплату якасна выкананай работы. У нас ужо ёсць добры вопыт далучэння малочных заводаў у Пінску, Століне і Камянцы.

Мадэрнізацыя вытворчай пляцоўкі ў Оршы зойме два гады. Пасля чаго «Савушкін-Орша» з малочнага камбіната ператворыцца ў вытворчасць натуральнай малочнай прадукцыі еўрапейскага ўзроўню, з абсталяваннем ад сусветных пастаўшчыкоў, максімальнай аўтаматызацыяй і найноўшымі тэхналогіямі ў сферы перапрацоўкі і вытворчасці прадуктаў харчавання.

# Новыя «хуткія» і дом для медыкаў

## Якія яшчэ змены чакаюць арганізацыі аховы здароўя Аршаншчыны?

**Як паведамляе галоўны ўрач Аршанскай цэнтральнай паліклінікі Аляксей КАРОТКІ, згодна з указам № 506 у сферы аховы здароўя прадугледжваецца правядзенне шэрагу мерапрыемстваў.**

Дзеля ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы арганізацый аховы здароўя і ўдасканалення медыцынскай дапамогі ў 2019—2023 гадах будзе закуплена лячэбнае і дыягнастычнае абсталяванне, вырабы медыцынскага прызначэння для арганізацый аховы здароўя. Сёлета запланавана набыць дзевяць аўтамабіляў для станцыі хуткай і неадкладнай медыцынскай дапамогі, капітальна адрамантаваць аддзяленне медыцынскай рэабілітацыі гарадской бальніцы № 3, таксама капітальна адрамантаваць два ліфты ў хірургічным корпусе гарадской лякарні № 1 імя Сямашкі і некаторыя іншыя мерапрыемствы.

Дзеля зніжэння выдаткаў на стацыянарную медыцынскую дапамогу сёлета запланавана будаўніцтва пральні на тэрыторыі гарадской бальніцы № 1.

А каб замацаваць кадры, прадугледжана будаўніцтва арэнднага дома ў 2019-м на 40 кватэр для медыцынскіх работнікаў у вёсцы Андрэеўшчына.

Павысіць даступнасць амбулаторнай дапамогі зможа будаўніцтва паліклінікі ў новым мікрараёне Оршы з распрацоўкай праектна-каштарысной дакументацыі ў 2020 годзе і заканчэннем будаўніцтва ў 2023-м.

У 2019—2023 гадах працягнецца закупка камп'ютарнай тэхнікі і праграмнага забеспячэння дзеля ўкаранення тэхналогій «Электронны рэцэпт», «Электронная амбулаторная карта», «Электронная медыцынская карта стацыянарнага пацыента».


## Информация о результатах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «МНИПИ» за 2018 г.

Бухгалтерский баланс на 01.01.19 г.

| Наименование показателей | Код строки | На 31.12.2018 г. (тыс. руб.) | На 31.12.2017 г. (тыс. руб.) |
|---|---|---|---|
| 1. Долгосрочные активы | 190 | **13 124** | **11 655** |
| Основные средства | 110 | 11 102 | 9 908 |
| Нематериальные активы | 120 | 21 | 18 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 1 793 | 1 521 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 208 | 208 |
| 2. Краткосрочные активы | 290 | **6 093** | **5 542** |
| из них: | | | |
| Сырье, материалы и др. аналогичные активы | 211 | 476 | 430 |
| Затраты в незавершенном пр-ве | 213 | 2 088 | 504 |
| Готовая продукция и товары для реализации | 214 | 1 265 | 1 039 |
| Расходы будущих периодов, НДС, Краткосрочная дебиторская задолженность | 230-250 | 448 | 691 |
| Денежные средства | 270 | 1 816 | 2 878 |
| **Баланс — всего (активы)** | **300** | **19 217** | **17 197** |
| 3. Собственный капитал | 490 | **15 728** | **14 298** |
| 5. Краткосрочные активы | 690 | **3 489** | **2 899** |
| В том числе: кредиторская задолженность по поставщикам и авансам полученным | 631-632 | 1 406 | 1 176 |
| По оплате труда | 635 | 169 | 148 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 633-670 | 1 914 | 1 575 |
| **Баланс — всего (пассивы)** | **700** | **19 217** | **17 197** |

Отчет о прибылях и убытках за 2018 г.

| Наименование показателей | 2018 г. (тыс. руб.) |
|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 6 206 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 5 793 |
| Прибыль от реализации | 413 |
| Прибыль (убыток) от прочей текущей деятельности | (121) |
| Прибыль от инвестиционной деятельности | 438 |
| Прибыль от финансовой деятельности | (167) |
| **Прибыль до налогообложения** | **563** |
| Налоги, сборы и платежи из прибыли | (164) |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ** | **399** |

Получено аудиторское заключение от ОДО «НемигаАудит» о том, что бухгалтерская отчетность ОАО «МНИПИ» составлена в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверна во всех существенных аспектах, отражает реальное финансовое положение и результаты финансово-хозяйственной деятельности ОАО «МНИПИ» за 2018 г.

УНП 100039847



## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Унитарного предприятия «Строительно-монтажное управление «Подъем» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **здания производственного цеха инв. № 100/С-62022 общей площадью 349,6 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 140100000001031245 (право постоянного пользования) площадью 0,2863 га по адресу: Брестская область, г. Брест, ул. Вычулки, 129/1** *(земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона реки Мухавец, площадь – 0,2863 га).*

**Начальная цена с НДС (20 %) – 145 200,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (14 520,00 бел. руб.).**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: юр. лицом РБ — копии устава со штампом о проведении гос. регистрации, свидетельства о гос. регистрации и их подлинники для заверения копий, доверенность представителю юр. лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица; иностранным юр. лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юр. лица или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем РБ — копия свидетельства о гос. регистрации и подлинник для заверения копии; иностранным индивидуальным предпринимателем — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя РБ — нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физ. лица, индивидуального предпринимателя — легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физ. лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физ. лица, индивидуального предпринимателя, юр. лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

В день проведения торгов победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) подписывает протокол о результатах торгов.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **30.04.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.04.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 28 сакавіка 2019 года.**